Навуку—на службу сацрэканструкцыі сельскай гаспадаркі

Пралетары ўсіх краёў, аднаўчайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 238 (4194)
Чацьвер, 22 кастрычніка 1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

Біцца за поўнае выкананьне фінансавага пляну

Выкананьне фінансавага пляну складае адну з важнейшых гаспадарча-палітычных задач, ад пасьпяховага вырашэньня якой у вялікай ступені залежыць тэмпы нашага разьвіцьця. У радзе пастаноў партыі гэта задача падкрэслена, як адна з рашаючых, асноўных, якая патрабуе самых уважлівых да сябе адносін з боку ўсіх партарганізацый, савецкіх, кааперацыйных і гаспадарчых органаў.

Між тым, ход выкананьня фінпляну сьведчыць аб тым, што ў цэлым радзе месц да выкананьня фінпляну няма яшчэ належных адносін, што сям-там роля яго проста недаацэньваецца.

Нядаўна камісія выкананьня пры СНК Саюзу прызнала ход выкананьня фінпляну па БССР нездавальняючым. Прычын такога становішча трэба перш за ўсё шукаць у невыстарчальнай увазе да пытаньняў сацыялістычнага накапленьня, пасярэньня тавараабароту, мабілізацыі сродкаў, да выкананьня фінпляну ў цэлым.

У радзе прычын недавыкананьня фінпляну нельга не адзначыць буйных недахопаў і ў рабоце самога фінансавага апарату, у наяўнасьці тут бюракратызму, непаваротлівасьці, няўменьня падчас зьвязаць сваёй адміністрацыйнай дзейнасьці з шырокай арганізацыйна-масавой работай сярод працоўных пластоў насельніцтва.

У «Зьвязьдзе» за 18 кастрычніка апублікавана пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб выкананьні фінпляну. У гэтай пастанове ЦК і СНК канстатавані, што «пры пасьпяховым выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў рядам раёнаў і гарадоў (Гомель, Ворша, Менск, Сіроцінка, Любань) партыйнае і савецкае кіраўніцтва адасобных раёнаў (Асьвейскага, Бягомльскага, Мсьціслаўскага, Ірапейскага і Расонскага) не забясьпечыла належных тэмпаў і мэтадаў работы і дапусьціла зрыў плянаў 3-га кварталу, што зьяўляецца простым невыкананьнем дырэктыў ліпеньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб узмацненьні работы па выкананьні фінансавага пляну».

Пастанова намеціла неабходныя практычныя мерапрыемствы па ліквідацыі прарываў у фінпляне. За ажыцьцяўленьне гэтых мерапрыемстваў партыйныя і гаспадарчыя арганізацыі павінны ўзяцца па-баявому, наладзіўшы сыстэматычную праверку і кантроль за ходам рэалізацыі фінпляну.

ВСНГБ, Наркамснаб, райвыканкомы і гарсаветы абавязаны дабіцца карэннага пералому па лініі ўласных накапленьняў прадпрыемстваў аграмаджанага сэктару, забясьпечыць ліквідацыю тут недабору.

Перад райкомамі і райвыканкомамі па станова ЦК і СНК паставіла задачу штодзённага апэрацыйнага кіраўніцтва справай мабілізацыі сродкаў, сыстэматычнай праверкі выкананьня сваіх дырэктыў. З гэтай мэтай пастанова абавязвае ШТОДЭКАДНА заслухоўваць даклады сельсаветаў аб ходзе мабілізацыі сродкаў.

ЦК і СНК зварачаюць асаблівую ўвагу на важнасьць правядзеньня сыстэматычнай масавай работы вакол выкананьня фінпляну, «на стварэньне пастаяннага фінансавага актыву, у першую чаргу з ударнікаў, рабочых і калгасьнікаў». У гэтых адносінах трэба шырока выкарыстоўваць вопыт перадавых гарадоў, раёнаў, сельсаветаў, прадпрыемстваў і калгасаў. Шырокая масава-растлумачальная работа — важнейшая ўмова пасьпяховага выкананьня фінпляну.

У якасьці практычнага мерапрыемства пастановай вызначана правядзеньне ўсебеларускага рапарту мясцовых арганізацый аб ходзе выкананьня фінпляну чацьвертага кварталу. Гэта кампанія павінна набыць шыроні масавы характар, ператварыцца ў магутны сродак мабілізацыі рабочых, калгасьнікаў і беднякоў і сераднякоў-адзіначкоў вакол баявых задач фінансавай работы.

У якасьці аднаго з мерапрыемстваў, якое стымулюе выкананьне фінпляну, трэба шырэй практыкаваць прэміяваньне ўдарнікаў фінансавага фронту, шырэй папулярызаваць у друку станоўчыя мэтады работы.

Пастанова ЦК і СНК адзначыла зусім нездавальняючае становішча з пазыкапленьнем па сыстэме спажывецкай кааперацыі, асабліва ў вёсцы (ў трэцім квартале 53,6 проц.), а таксама па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру (66 проц.). Яшчэ горш стаіць справа па лініі ўкладаў у ашчадкасы, дзе ёсьць поўны зрыў пляну, у разультаце «зусім невыстарчальнай увагі ўсіх арганізацый да ашчаднай справы».

Гэтыя вучасткі работы павінны прыцягнуць да сябе выключную ўвагу партарганізацый, павінны быць узяты пад асобны нагляд партыі і рабочай клясы.

Рашаючай умовай выкананьня фінпляну зьяўляецца правядзеньне выразнай клясавай лініі на ўсіх вучастках гэтай работы. Факты праваапартуністычных прымірэнчых адносін да кулака, роўна як і «лявацкіх» загібаў у адносінах да серадняцтва трэба высмяваць распалёным жалезам. Усе нядоімкі з кулацкіх гаспадарак па абавязковых плацяжох павінны быць апагнаны неадкладна і поўнасьцю.

Вядучы бязьлітасную барацьбу з апартуністычнымі скажэньнямі лініі партыі ў пытаньнях фінансавага будаўніцтва, шырока арганізуючы сацспаборніцтва і ўдарніцтва, прыцягваючы да актыўнага ўдзелу масы працоўных—забясьпечым да 14 кастрычніка рашучыя перамогі на фінансавым фронце.

«Вялізарныя задачы завяршэньня гаспадарча-культурнага будаўніцтва трэцяга рашаючага году пяцігодкі ў IV квартале і неабходнасьці стварэньня фінансавай базы для забясьпячэньня ўсяго гаспадарчага пляну апошняга году пяцігодкі патрабуюць ад усіх партыйных органаў, гаспадарчых, фінансавых і грамадзкіх арганізацый бальшавіцкай работы па выкананьні фінансавага пляну».

Пад знакам выкананьня гэтай дырэктывы ЦК і СНК разгорнем энэргічную барацьбу за поўную рэалізацыю фінпляну чацьвертага кварталу рашаючага году пяцігодкі.

Саўгасы і калгасы чакаюць практычнай дапамогі ад навуковых работнікаў

На барацьбу за вытворчае замацаваньне калгасаў, за якасьць, за высокі ўраджай!

Адкрыты ліст пленуму Грычанскага сельсавету, Менскага раёну,

трэцяму ўсебеларускаму зьезду навуковых работнікаў

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, у жорсткай барацьбе з клясавым ворагам—кулаком і яго агентамі — правымі і «левымі» апартуністамі, краіна Саветаў дасягнула вялізарных перамог у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Асноўная маса працоўнага сялянства зразумела перавагу буйной калгаснай вытворчасьці, перавагу калектыўнай працы. 60 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па СССР і 50 проц. па БССР на добраахвотных пачатках аб'ядналіся ў калгасы. Калгасьнікі сталі галоўнай апорай партыі і ўлады на вёсцы, сталі асноўнымі вытворцамі сельска-гаспадарчай прадукцыі.

Зараз партыя паставіла, як цэнтральную задачу — АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАЕ ЗАМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ, укараненьне зьдзельшчыны, дакладную пастаноўку ўліку працы, падрыхтоўку кадраў, барацьбу за якасьць, за ўраджай, за высокія паказальнікі ва ўсіх галінах гаспадаркі.

Наш Грычанскі сельсавет, Менскага раёну, калектывізаваны на 92 проц. У сельсавеце — пры калгасы. Ужо арганізаваны дзьве малочна-таварныя фэрмы. Ствараюцца дзьве сьвінагадоўча-таварныя фэрмы і дзьве садова-гародніна-пчалярскія. Сельсавет ставіць сваёй задачай — працаваць па-новаму, не адставаць ад тэмпаў, якія ёсьць па ўсёй БССР.

Але ў нас яшчэ не хапае кадраў, няма адпаведных агратэхнічных ведаў, часамі адсутнічае выстарчальная дапамога па правільнай арганізацыі працы ў калгасах.

Таварышы навуковыя работнікі! Ваш абавязак ДАПАМАГЧЫ КАЛГАСЬНІКАМ ХУТЧЭЙ НАВУЧЫЦЦА ВЕСЬЦІ НОВУЮ БУЙНУЮ КАЛЕКТЫЎНУЮ ГАСПАДАРКУ, НАВУЧЫЦЬ НАС ЯК ПРАКТЫЧНА ТРЭБА ЗМАГАЦЦА ЗА ЎЗЬНЯЦЬЦЕ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ, ЗА ВЫСОКІЯ ЯКАСНЫЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ Ў САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ГАСПАДАРЦЫ.

Наша калгаснае будаўніцтва ўжо мае за сабой вялізарнейшы арганізацыйны вопыт. Вялікая колькасьць калгасаў патроіла прадукцыйнасьць працы, патроіла даходнасьць калгасаў і калгасьнікаў, узьняла на аснове спэцыялізацыі таварнасьць гаспадаркі.

А між тым вопыт лепшых яшчэ ня досыць абагульваецца і скарыстоўваецца нашымі навуковымі і навукова-дасьледчымі установамі, каб зрабіць яго здабыткам мільёнаў мас калгасьнікаў, каб тым самым яшчэ больш паскорыць наш рух наперад у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Ад гэтага надзвычай многа траціць наша народная гаспадарка. Сьведкамі зьяўляюцца калгасы нашага сельсавету. Як у мінуўшчыня страты збожжа на полі, у часе малацьбы і г. д. Ад невыпалёў толькі на некалькі процантаў перавышае ўраджай аднаасобных гаспадарак. Удой кароў на МТФ вельмі малы, не дасягае плянавых намячэньняў.

Сіласаваньне, ня гледзячы на ўсю сваю важнасьць, пачалося ў нашых калгасах толькі ў гэтым годзе. Па сельсавеце засіласавана 1.088 тон. План сіласаваньня выкананы на 136 проц. І ўсё-ж ня менш 1.000 тон сіласнай масы засталося нескарыстанай з тай прычыны, што калгасы ня былі знаёмы з вопытам сіласаваньня больш простымі спосабамі.

Савецкая Беларусь—краіна пераважна жывёлагадоўчая. Работа па стварэньні і ўмацаваньні сацыялістычнага сэктару ў галіне жывёлагадоўлі зьяўляецца цэнтральнай задачай бліжэйшага часу ў галіне сельскай гаспадаркі. Толькі стварыўшы моцную кармовую базу, мы здолеем дабіцца таго, каб «1931 і 1932 г.г. зьявіліся гадамі такога-ж рашучага пералому ў галіне разгортваньня жывёлагадоўлі, якімі былі 1929 і 1930 гады ў справе сацыялістычнай збожжавай гаспадаркі» (з адозвы ЦК УсеКП(б) ад 30/VII).

Зараз калгасы рыхтуюцца да другой зімоўкі сацыялістычнай жывёлагадоўлі. У абавязак кожнага навуковага работніка, які працуе ў галіне рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, прыняць удзел як у падрыхтоўцы, так і ў правядзеньні самой зімоўкі. Трэба паказаць, як найбольш рацыянальна і эканомна скарыстаць кормы. Наш лозунг — вывесьці жывёлу на вясну ў поўным целе!

Уключайцеся-ж у паход за вырашэньне гэтых важнейшых задач сёнешняга дня!

Няхай навукова-дасьледчыя інстытуты арганізуюць у калгасах апорныя пункты па вопытна-паказальным доглядзе і ўтрыманьні жывёлы ў зімовы час, няхай разгорнуць шырокую работу па правільнай арганізацыі працы на кожнай МТФ і СТФ. Арганізуйце сацыялістычны абмен вопытам лепшых, пакажэце, як лепшыя калгасы, лепшыя таварныя фэрмы дабіліся сваіх посьпехаў, зрабеце іх практыку здабыткам усіх калгасаў, усіх таварных фэрм.

Пастаўце цалкам навуку на службу сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Праз новую вытворча-тэхнічную бальшавіцкую кнігу ўзбройце мільёны калгасьнікаў і рабочых саўгасаў агра-тэхнікай і зоатэхнікай. Дайце нам кнігу, якая будзе цалкам адказваць задачам сацыялістычнай рэканструкцыі, якая будзе баявой і актуальнай, якая ўзброіць нас патрэбнымі ведамі для больш шпарчага вырашэньня ўсіх задач, пастаўленых перад сацыялістычным сэктарам сельскай гаспадаркі.

Саюз навукі і сацыялістычнай вытворчасьці забясьпечыць нам непераможны рух наперад, забясьпечыць далейшыя посьпехі самой навукі ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

МЫ ПРЫВАШАЙ ДААПАМОЗЕ ЎСЕ СВАЕ СІЛЫ АДДАМО НА БАРАЦЬБУ ЗА ВЫСОКІЯ ЯКАСНЫЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ, НА БАРАЦЬБУ ЗА ЎРАДЖАЙ, ЗА ЎМАЦАВАНЬНЕ ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ, ІЛЬНАВОДЧЫХ І ГАРОДНЫХ КАЛГАСАЎ.

ПА ДАРУЧЭНЬНІ ПЛЕНУМУ:

Старшыня Грычанскага сельсавету А. ВАРОНІЧ.

Сакратар ячэйкі КП(б)Б В. ЦЮРЫН.

Старшыня сельска-гаспадарчай сэкцыі сельсавету ВГРАНОМ МАРКАЎ.

20/X—1931 г.

Пяцідзёнік праверкі перакідкі цягі на зяблева

Максымальна скарыстаць жывую цягавую сілу

Трактары—на кругласутачную работу.—Апэрацыйнае заданьне—кожчай брыгадзе.—Наладзіць штодзенны ўлік і кантроль выкананьня заданьняў.—На грамадзкі буксір адстаючых

Калгасцэнтр і саўгастрэсты ў пяцідзёньнік ня ўключыліся

З 20 па 25 кастрычніка праводзіцца, абвешчаная «Праўдой», масавая праверка пераключэньня цягавай сілы — як трактараў, так і коняй — на зяблеве ворыва. Гэта мерапрыемства павінна выклікаць карэнны пералом у ходзе зяблева і забясьпечыць яго выкананьне.

Здавалася-б, што цэнтральныя — вялмельна-калгасныя і саўгасныя органы павінны былі прыняць актыўны ўдзел у гэтай праверцы.

На справе-ж мы гэтага ня маем. Работнікі Калгасцэнтру, Сьвінаводтрэсту і Белсаўгастрэсту якіх непасрэдна датычыцца справа ўзьняцьця зяблева, аб пяцідзёньніку, які праводзіцца «Праўдой», нават і ня чулі. На запытаньне: «якія прыняты меры з вашага боку?»—намесьнік дырэктара Белсаўгастрэсту тав. Самохін аж зьдзівіўся і адказаў: «Мы далі ўказаньні месяц назад».

Як выконваюцца ўказаньні, ні Сьвінаводтрэст, ні Белсаўгастрэст, ні Калгасцэнтр ня ведаюць.

Становішча-ж з уздымам зяблева па саўгасах і калгасах яркa гаворыць, што ў большасьці месц дырэктывы аб перакідцы трактараў і коняй груба ігнаруюцца. Так, напрыклад, саўгас «Камаровічы» (сыстэмы Белсаўгастрэсту) па пляне павінен узьняць 618 гэкт. зяблева, а ўзьняў на 20 кастрычніка толькі 20 гэкт. Саўгас «Дуброва» з пляну ў 800 гэкт., узьняў 35, Русінавічы—300 гэкт., а ўзьняў 65 гэкт.

Такое-ж становішча наглядаецца і па сыстэме «Сьвінавод». Так, саўгас «Сялец» павінен узьняць 3.518 гэкт. зяблева, узьняў-жа толькі 250; «Разальмова»—1.400, а ўзьняў 180 гэкт.; «Крывое»—470 гэкт., а ўзьняў 64 гэкт.; «Горы-Абчаг»—500, узьняў—95; «Яловa»—870, узьняў 250 і «Пачаевічы»—500, узьняў —70. Трэба адзначыць яшчэ і той факт, што два апошнія саўгасы за пяцідзёньку—з 15 па 20 кастрычніка не ўзьнялі ніводнага гэктара пад зяблева.

Саўгасы-ж, якія па-бальшавіцку ўзяліся за выкананьне пляну зяблева, на сёнешні дзень дасягнулі вялікіх посьпехаў. Яны ня толькі выканалі, але і перавыканалі пляны. Так, напрыклад, саўгас «Лемніца» (сыстэмы «Сьвінаводу») меў заданьне ўзьняць пад зяблева 350 гэкт., а ўзьняў 468. Саўгас «Ціхінічы» па пляне павінен быў узьняць 150 гэкт. а ўзьняў 230.

Ня гледзячы на неаднаразовыя сыгналы «Зьвязды» і патрабаваньні аб пераключэньні трактараў на зяблева, усё-ж на сёнешні дзень няма амаль ніякага зруху. Некаторыя МТС упарта не жадаюць выканаць гэтай дырэктывы партыі. Паводле апошніх паведамленьняў, атрыманых Трактарацэнтрам, відаць, што Менская МТС, маючы 32 трактары, пераключыла на зяблева толькі 14 (44 проц.); Смалявіцкая—з 42 пераключыла на зяблева 34 трактары; Слуцкая—з 35 пераключыла 28 і Дрысенская—з 24 пераключыла 17 трактараў. Такое становішча інакш як сьвядомым ігнараваньнем указаньняў дырэктыўных органаў разглядаць нельга. Неабходна прыцягнуць да судовай адказнасьці кіраўнікоў МТС, якія адсна ўхіляюцца ад перакідкі трактараў на зяблева.

Нельга не адзначыць і таго, што ў радзе раёнаў дзейнасьці МТС калгасы спадзяюцца выключна на трактарны парк і не скарыстоўваюць коняй на зяблеве. Яркім прыкладам гэтага зьяўляецца калгас «Ленінскі шлях», Клімавіцкага раёну. У гэтым калгасе, ня гледзячы на наяўнасьць вольных коняй, усё-ж зяблева не ўздымаецца—спадзяюцца на трактары.

Пяцідзёньнік праверкі павінен сканцэнтраваць увагу ўсіх раённых як вялмельна-калгасных, так і партыйных арганізацый на выкананні пляну зяблева. Неабходна пераключыць максымальную колькасьць конскай цягавай сілы і ўсе трактары на зяблева і гэтым самым забясьпечыць карэнны пералом на ўзьняцьці тэмпаў ворыва.

Неабходна даць самы рашучы, бязьлітасны адпор апартуністам, якія, ігнаруючы дырэктывы аб мабілізацыі мас на зяблева, аб перакідцы коняй і трактараў на зяблева, дапамагаюць клясаваму ворагу сарваць важнейшае мерапрыемства —зяблеве ворыва.

Раўняцца па брыгадзе Сельвановіча

ЛЕПЕЛЬ. (Ад наш. спэц. кар.).

Ня гледзячы на вялізарнейшае значэньне зяблева, яно ў Лепельскім раёне яўна зрываецца. Інакш нельга сказаць, калі прыняць над увагу, што па раёне ўзьнята пад зяб ня больш 15 проц. належнай плошчы.

У чым прычына ганебнага прарыву? На гэта пытаньне наогул можна сказаць, што прычына адставаньня Лепельскага раёну па зяблеве хаваецца ў палітычнай недаацэнцы зяблевага ворыва з боку вялмельна-калгасных органаў. Наглядаецца апартуністычная стаўка на чарговасьць кампаній. Спасылаюцца па тое, што «мы зараз заняты ўборкай буль-бы, упарадкаваньнем ільну, а скончыўшы гэта мы возьмемся за зяблева».

Гэта можна прасачыць на прыкладзе калгасу «Чырвоны прамень», «Чырвонае Мацюшына», якім райкалгасаюз даў «благаславеньне» адлажыць зяблева на апошнюю чаргу. Старшыня райкалгасаюзу тав. Лапацін проста разводзіць рукамі і ня можа прыняць ніякіх канкрэтных захадаў да фарсаваньня зяблевага ворыва.

Дырэктыва СНК аб пераключэньні цягавай сілы на зяблева ня выканана. Калгасы «Ізабелі», «Усход», «Чырвоная Перамога» і амаль усе калгасы раёну маюць дзесяткі незанятых на рабоце коняй, якія з посьпехам могуць быць скарыстаны для хутчэйшага выкананьня пляну зяблева. Не хапае ініцыятывы і арганізаванасьці ў гэтай адказнейшай рабоце. Замяняе іх паўнейшы самацёк.

Калі МТС здолела добра наладзіць зда чу калгасных таварных ліпкаў 1 апрацоўку ільну, то гэтага нельга сказаць пра арганізацыю працы па зяблеве; гэты вопыт не скарыстаны і МТС застаецца ў хвасьце іншых МТС БССР па зяблеве. Два трактары на другім вытворчым участку МТС сталі каля аднаго месяца з-за адсутнасьці чарвячных валоў. На трэцім вучастку часта стаяць трактары з-за адсутнасьці такіх недэфіцытных дробязяй, як спружынкі да роліка камутатара. Дырэкцыя МТС ня здолела забясьпечыць трактары неабходнай колькасьцю дэталяй, якія хутка поўнуцца. На гэтых-жа вучастках работа па зяблеве не наладжана круглыя суткі, а толькі днём, што таксама замаруджвае тэмп падёму зябі.

Калгас «Чырвоная Жэжліна» да 1-XI поўнасьцю канчае зяблева на 600 гэктарах. Брыгада трактарыста Сельвановіча перавыконвае нормы выпрацоўкі па ўздыме зябі, дзякуючы ўпартай і акуратнай працы на працягу круглых сутак. Прыклад калгасу «Чырвонае Жэжліна» і трактарнай брыгады Сельвановіча паказвае, як трэба арганізоўваць зяблеве ворыва.

У Лепелі ёсьць усе магчымасьці для поўнага і своечасовага выкананьня пляну зяблевага ворыва. Але ўзятыя Лепелем тэмпы не забясьпечваюць поўнага і своечасовага выкананьня пляну. Лепельскія раённыя арганізацыі павінны мабілізаваць масы на выкананьне пляну зяблева, памятаючы, што зяблева—адно з асноўных зьвеньняў вытворчага ўмацаваньня калгасаў.

Арцельны.

Усебеларуская канфэрэнцыя ІТР саюзу рабочых МТС і батрацтва

Цэнтральнаму Камітэту КП(б)Б

Правадыру і арганізатару сацыялістычнага будаўніцтва ЦК КП(б)Б. 1-я Ўсебеларуская канфэрэнцыя спэцыялістаў саюзу рабочых МТС і батрацтва, шле гарачае пралетарскае прывітаньне. Пад вытрыманым кіраўніцтвам ленінскай партыі, пралетарыят і шырокія копы працоўных мас саюзу атрымалі рашучыя перамогі на фронце індустрыялізацыі краіны і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі на базе высока-навуковай тэхніці. Дэтэрмінова выканан плян работ па радзе галін сацыялістычнай гаспадаркі, які забясьпечыў завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў «3-м рашаючым годзе пяцігодкі».

Канфэрэнцыя спэцыялістаў запэўняе ЦК КП(б)Б у тым, што мы, інжынэрныя-тэхнічныя работнікі разам з усёй рабочай клясай Беларусі, пад непасрэдным кіраўніцтвам камуністычнай партыі, самааддана будзем змагацца за яшчэ больш пасьпяховую сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі, па шляху калектывізацыі і машынізацыі.

Абяцаем шырока праводзіць працу па арганізацыйна-гаспадарчым закацваньні МТС — апорных пунктаў суцэльнай калектывізацыі, калгасаў, рашуча змагацца за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, падняцьце працдысцыпліны і ліквідацыі абязьпічы!.

На барацьбу за высокі ўраджай, якасьць і таварнасьць сацыялістычнай с/гаспадаркі, за масавую падрыхтоўку калгасных кадраў, за масавую падрыхтоўку і правядзеньне III бальшавіцкай вясны, за ўдасканаленьне тэхнікай і рашучае ўкараненьне яе ў сельскую гаспадарку.

Няхай жыве ЦК КП(б)Б — кіраўнік і арганізатар сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі!

Няхай жыве сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі!

1-я ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ІТР САЮЗУ РАБОЧЫХ МТС І БАТРАКОЎ.

Цэнтральнаму Камітэту УсеКП(б)

Першая канфэрэнцыя спэцыялістаў саюзу рабочых МТС і батракоў Беларусі шле шчырае прывітаньне кіраўніку сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі—ЦК УсеКП(б) і правадыру партыі тав. Сталіну.

Канфэрэнцыя запэўняе ЦК, што ўсю энэргію і сілу спэцыялісты саюзу рабочых МТС і батрацтва аддадуць на выкананьне і перавыкананьне пастаўленых перад намі задач па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, на барацьбу за высокі ўраджай, якасьць і таварнасьць сацыялістычнай сельскай гаспадаркі, за масавую падрыхтоўку калгасных кадраў, за масавую падрыхтоўку правядзеньня 3-й бальшавіцкай вясны, за аўладаньне тэхнікай і рашучае ўкараненьне яе ў сельскую гаспадарку, за чыстату марксыцка-ленінскай мэтадалёгіі ў агравуцы, за поўнае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Няхай жыве ленінскі ЦК УсеКП(б) і кіраўнік партыі тав. СТАЛІН.

1-я Ўсебеларуская канфэрэнцыя ІТР саюзу рабочых МТС і батрацтва.

175.000 тон бульбы Ленінграду

13 райспажыўсаюзаў

гоняць уніз крывую адгрузкі

Патроіць тэмпы. На аснове сацспаборніцтва і ўзаемадапамогі сыстэма Белкаапсаюзу павінна дабіцца поўнага і своечасовага выкананьня абавязацельстваў перад пралетарамі Ленінграду

АДГРУЗКА БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ

(У ТОНАХ)

17 кастрычніка	18 кастрычніка	19 кастрычніка
4.051	4.267	7.592

ВЫШЭЙ ТЭМПЫ АДГРУЗКІ!

Сацдагавор з Заходняй воблаццю выканаць па ўсіх пунктах

Трыкутнік Белкаалгароднікі зьвярнуўся да партыйных і прафэсыйных арганізацый БЫХАЎСКАГА, КЛІЧАЎСКАГА, КРУПСКАГА, ЛЕПЕЛЬСКАГА, МСЬЦІСЛАЎСКАГА, СЛУЦКАГА, СТАРОБІНСКАГА, УВАРАВІЦКАГА, ВУШАЦКАГА, ЧАВУСКАГА, ЧАШНІЦКАГА ЧЫРВОНА-СЛАБОДСКАГА І РАГАЧОЎСКАГА РАЙСПАЖЫЎСАЮЗАЎ з адозвай аб максымальным узмацненьні адгрузкі бульбы Ленінграду.

«Мы выйшлі на сацспаборніцтва Заходняю воблаццю па 100-процантным выкананьні пляну адгрузкі бульбы Ленінграду да 1 лістапада,—гаворыцца ў адозьве. — Сёньня намі атрыманы весткі, што Заходняя воблаць выканала свой плян на 73 проц., наша-ж сыстэма адгрузіла толькі 53 проц. пляну.

У той час, калі Аршанскі, Бабруйскі, Бягомльскі, Дрысенскі, Клімавіцкі, Лёзьнянскі, Крычаўскі, Магілеўскі, Нораўгарскі, Рэчыцкі, Талочынскі і Чэрыкаўскі райспажыўсаюзы ўжо скончылі адгрузку бульбы, а Асіповіцкі, Глускі, Жлобінскі, Мазырскі, Касьцюковіцкі, Капыльскі, Любаньскі, Попацкі, Расонскі і Шклоўскі райспажыўсаюзы наблізіліся да выкананьня пляну — ВЫСВАІМ АДСТАВАНЬНЕМ СТВАРАЕЦЕ РЭАЛЬНУЮ ПАГРОЗУ ЗРЫВУ АГУЛЬНАГА ПЛЯНУ АДГРУЗКІ І ЗРЫВАЕЦЕ САЦСПАБОРНІЦТВА З ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЬЦЮ.

З 39.000 тон, якія яшчэ трэба адгрузіць па нашай сыстэме, вашы арганізацыі павінны даць 27.000 тон. Такім чынам, ад вашай работы залежыць своечасовае выкананьне важнейшага заданьня партыі і ўраду.

Мы зварачаемся да вас з заклікам — на падставе шырокага сацспаборніцтва паміж раёнамі, сельспажыўтаварыствамі, калгасамі і сельсаветамі, прыцягваючы шырокія масы калгасьнікаў, актыву, мабілізуючы для непасрэднай працы на мясцох увесь свой апарат, дабіцца неадкладнага пералому, сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў работы, забясьпечыць ліквідацыю допушчаных прарываў, поўнае выкананьне вызначаных плянаў. Чакаем вестак аб канкрэтных выніках прынятых вамі мерапрыемстваў».

Шклоўскі райспажыўсаюз перавыканаў заданьне

СЫСТЭМА ШКЛОЎСКАГА РАЙСПАЖЫЎСАЮЗУ ПАСЬПЯХОВА ВЫКАНАЛА ПЛЯН АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ, НА 20 КАСТРЫЧНІКА АДГРУЖАНА 2.778 ТОН ЗАМЕСТ 2.734 ТОН, ВЫЗНАЧАНЫХ ПЛЯНАМ. ЗАДАНЬНЕ, ТАКІМ ЧЫНАМ, ПЕРАВЫКАНАНА НА 2 ПРОЦ.

СТАРШЫНЯ РАЙСПАЖЫЎСАЮЗУ МАЕЎСКІ.

Быхаў уключыўся ў фінэстафату

БЫХАЎ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). У ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ ФІНЭСТАФЕТЫ ЎКЛЮЧЫЛІСЯ 15 КАСТРЫЧНІКА. СКЛАДЗЕН ШТАБ; МАБІЛІЗОВАН ФІНАНСАВА - БАНКАЎСКІ АПАРАТ І ЎВЕСЬ ПРАФАКТЫЎ. ПРЫСТУПІЛІ ДА ПРАКТЫЧНАЙ РАБОТЫ.

Калгас „Чырвоная Студзёнка" разбазарвае бульбу

ЛЕПЕЛЬ.

Бульбазагатоўкі па раёне праходзяць марудна. Кулацтва і яго агентура ведуць шалёную агітацыю супроць здачы бульбы дзяржаве. Яны імкнуцца выграць на нязжытых яшчэ сярод адсталых калгасьнікаў спажывецкіх пачуцьцёх і агітуюць калгасьнікаў за разбазараньне бульбы, за продаж ле прыватніку. Характэрным прыкладам зьяўляецца калгас «ЧЫРВОНАЯ СТУДЗЁНКА» (Пышнянскі сельсавет). СТАРШЫНЯ ГЭТАГА КАЛГАСУ БАЛОТНІК САМАВОЛЬНА ПРАДАЕ КАЛГАСНУЮ БУЛЬБУ. Гэта ў той час, калі КАЛГАС ДАЛЕКА ЯШЧЭ НЯ ВЫКАНАЎ КАНТРАКТАЦЫЙНАГА ДАГАВОРУ АБ ЗДАЧЫ БУЛЬБЫ ДЗЯРЖАВЕ.

У даным выпадку мы маем адкрытае выступленьне агентуры кулацтва супроць мерапрыемстваў партыі і ўраду. Учынак старшыні калгасу «Чырвоная студзёнка» зьяўляецца красамоўным прыкладам кулацкага супраціўленьня загатоўкам.

Трэба моцна ўдарыць па выразьніках кулацкіх, спажывецкіх настроеў—па апартуністах. Трэба дабіцца максымальнага фарсаваньня бульбазагатовак.

ПРАВЕРКА НАЯЎНЫХ ФОНДАЎ БУДМАТАР'ЯЛАЎ

Загад № 2 асобнага ўпаўнаважанага СНК па будаўніцтве IV кварталу і намесьніка наркома РСІ БССР ад 21 кастрычніка

Для высьвятленьня колькасьці наяўных фоднаў асноўных будматар'ялаў (цэглы, цэменту, вапны, жалеза ўсіх гатункаў, дахавага, кацельнага, балек таўравых і швэлераў, труб усіх гатункаў, рыдыятараў, пяску крупнага і піленага, цьвікоў, шкла і топ) у мэтах больш правільнага манэўраваньня гэтымі фондамі і рэгуляваньня ў далейшым справай забясьпячэньня будаўніцтва будматар'яламі, загадваю:

1. Усім прарабам пабудоў і кіраўніком адміністрацыйных, гаспадарчых, трансвартных, каапэрацыйных і грамадзкіх установ і арганізацый, якія маюць на сваіх складах і на пабудовах (якія дзейнічаюць, скончаны і кансэрваваны) вышэйпералічаныя будматар'ялы, у 2-х дзенны тэрмін ад дня апублікаваньня гэтага загаду, падаць мясцовым КК-РСІ весткі аб фактычнай наяўнасьці гэтых матар'ялаў з паказаньнем гатункаў па становішчы на 22-га кастрычніка 1931 году за подпісам прараба, або адказнага распарадчыка матар'ялам (там, дзе прараба няма) і асобы, адказнай за матар'яльны ўлік.

УВАГА: 1. Прадстаўленьне паказаных вестак датычыць наступных гарадоў і раённых цэнтраў: Менск, Гомель, Віцебск, Магілеў, Ворша, Бабруйск, Мазыр, Полацак, Барысаў, Крычаў, Быхаў, Касьцюковічы, Рэчыца, Горкі.

2. Ад прадстаўленьня вестак аспаб'яюцца ўсе аб'екты спэцбудаўніцтва.

2. КК-РСІ паказаных гарадоў і раёнаў не пазьней 27 кастрычніка 1931 г. прыспаць мне сьпешнай поштай або нарочным падагуленыя даныя на падставе гэтых вестак па асобных відах матар'ялаў і ўласьніка апошніх, з паказаньнем іх месца знаходжаньня.

3. Дырэктарам усіх цагелень, вапняных, сілікатных і чарапічных заводаў у той-жа тэрмін прыслаць мне сьпешнай поштай у адрас ЦКК-НК РСІ весткі аб фактычнай наяўнасьці гатовай прадукцыі і цэглы-сырцу на 22 кастрычніка за подпісам сваім і загадчыка ўлікам.

4. Адказнасьць за своечасовую і правільную прысылку вестак усклядаецца: на пабудовах — на прарабаў і бухгальтароў пабудоў, в па астатніх аб'ектах—на кіраўнікоў установ і арганізацый, а таксама на асоб, адказных за матар'яльны ўлік.

5. Падпісьвальнікі неабходнасьць асаблівага выразнага і своечасовага выкананьня гэтага загаду, папярэджаны, што вінаватыя ў несвоечасовым і няправільным прадстаўленьні вестак, будуць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

Асобна-ўпаўнаважаны СНК — намесьнік наркома РСІ БССР ГУРЭВІЧ.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

РЫХТАВАЦЦА ДА ПЕРАВЫБАРАЎ ПАРТОРГАНАЎ

Арганізацыйна і гаспадарча ўмацаваць калгасы! Сваячасова выканаць пляны загатовак! Ліквідаваць прарывы на фронце разгортвання сацыялістычнай жывёлагадоўлі!

—АСНОЎНЫЯ ЛЁЗУНГІ ПАДРЫХТОЎКІ

Множыць посьпехі чырвонажэжлінскай ячэйкі ў арганізацыі калгаснай вытворчасьці

Разгарнуць самаправерку

Да перавыбараў кіруючых органаў вясковых партарганізацый застаўся параўнаўча кароткі пэрыяд. Яго трэба максымальна скарыстаць для глыбокай і ўсебаковай праверкі работы сельпарткомаў і ячэек.

Праверка павінна выявіць на колькі сельпарткомы і ячэйкі КП(б)Б у сваёй штодзённай рабоце ВЫРАЗНА АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЛІ ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ, наколькі яны сваю практычную дзейнасьць, формы і мэтады працы падначалілі АСНОЎНЫМ ЗАДАЧАМ сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Праверку работы нізавых партыйных зьвеньняў на вёсцы неабходна шчыльна ўвязаць з вырашэньнем тых асноўных задач, якія зараз ставіць партыя. Першая і галоўная з гэтых задач — АРГАНІЗАЦЫЙНА - ГАСПАДАРЧАЕ ЎМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ на аснове правільнай арганізацыі працы і правільнага размеркаваньня ўраджаю. У кожнай ячэйцы неабходна праверыць наколькі яна павярнулася тварам да калгаснай вытворчасьці, да пытаньняў увядзеньня зьдзельшчыны, ліквідацыі ўраўнілаўкі, да размеркаваньня ўраджаю па прынцыпах колькасьці і якасьці затраченай працы.

Перавыбары партыйных органаў павінны павысіць бальшавіцкую пільнасьць партыйных мас у змаганьні з кулаком, які ў сваім супраціўленьні пераможнаму сацыялістычнаму наступленьню зьмяніў тактыку, які імкнецца ўзарваць калгасы знутры праз дэзарганізацыю калгаснай вытворчасьці.

Пытаньні павышэньня ўраджайнасьці і разгортваньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі павінны стаць у цэнтры ўвагі кожнай вясковай партячэйкі. Праверыць, ці падрыхтавана жывёла да зімоўкі, наколькі выкананы пляны стварэньня кармавой базы, скласьці фуражна-кармавыя балянсы, дабіцца правільнага севазвароту і дастасаваньня агракультурных мерапрыемстваў для павышэньня ўраджайнасьці—вось канкрэтныя задачы ячэек.

Апошнія зводкі гавораць аб тым, што У РАДЗЕ РАЁНАЎ ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКІ АДБЫВАЮЦЦА НАДЗВЫЧАЙ МАРУДНЫМІ ТЭМПАМІ. Самаправерачную работу і падрыхтоўку да перавыбараў кіруючых парторганаў неабходна цесна злучыць з арганізацыяй збожжазагатовак, са змаганьнем за сваячасовую першапачатковую апрацоўку ільну, за поўнае выкананьне плянаў адгрузкі бульбы. Пабальшавіцку кіраваць і арганізоўваць загатоўкі—адна з важнейшых задач вясковых партарганізацый. Кулацтва і яго агентура апартуністы, якія імкнуцца сарваць загатоўкі павінны атрымаць самы жорсткі адпор.

Нашы вясковыя партарганізацыі набылі вялікі вопыт у змаганьні за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі. Як напрыклад, мы ў даным выпадку паказваем на ПАРТЫЙНУЮ ЯЧЭЙКУ КАЛГАСУ «ЧЫРВОНАЯ ЖЭЖЛІНА» (Лепельскі раён), якая дзякуючы ўмеламу кіраўніцтву і бальшавіцкай рабоце дабілася вялікіх посьпехаў у справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасу, у справе разгортваньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

ЧЫРВОНАЖЭЖЛІНСКАЯ ячэйка КП(б)Б толькі дзякуючы таму, што ўхапілася за асноўнае зьвяно—за арганізацыю працы, за ліквідацыю ўраўнілаўкі, толькі дзякуючы таму, што павярнулася тварам да калгаснай вытворчасьці дабілася вялікіх посьпехаў у разьвіцьці гаспадаркі калектыву. Множыць прыклады перадавых ячэек, на іх практыцы вучыцца змаганьню за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за разгортваньне сацыялістычнай жывёлагадоўлі!

Перавыбары нізавых кіруючых парторганаў павінны прайсьці пад знакам яшчэ большага разгортваньня БАЛЬШАВІЦКАЙ САМАКРЫТЫКІ, пад знакам НЕПРЫМІРЫМАГА ЗМАГАНЬНЯ на два фронты, супроць правых і «левых» апартуністаў, за выразнае правядзеньне генэральнай лініі партыі.

Посьпехі перавыбараў залежаць ад таго, наколькі добра партыйныя арганізацыі правядуць падрыхтоўчую работу, наколькі шырока яны разгорнуць самаправерачную работу і ўцягнуць у яе партыйныя рабочыя і калгасныя масы. Час да пачатку перавыбараў досыць кароткі. Таму задача кожнай ячэйкі зараз жа разгарнуць шырокую самаправерку сваёй работы.

Кіраўнік і арганізатар перамог

Парт'ячэйка калгасу «Чырвоная Жэжліна» (Лепельскі раён) на справе давяла ўменьне кіраваць гаспадарча-вытворчым жыцьцём калгасу. Парт'ячэйка па-баявому ўзялася за справу арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасу і на гэтым вучастку работы мае значныя посьпехі.

Калгас «Чырвоная Жэжліна» мае жывёлагадоўча-ільняны напрамак. Гэта абавязвае калгас дасканала арганізаваць вядзеньне гаспадаркі, працу і кіраўніцтва. Дзякуючы таму, што парт'ячэйка ў цэнтр сваёй увагі паставіла іменна гэтыя пытаньні, калгас дабіўся вялікіх перамог.

Стада кароў разам з маладняком зараз складае 200 шт. Жывёла забясьпечана памяшканьнем і добрым доглядам. У мінулым годзе па праекце Малаканцэнтр пабудавана новай абора на 100 кароў, якая абсталявана дацкімі кармушкамі і добрымі прывязямі. Праўда, гэта абора каштавала каля 20 тыс. рублёў. Затраты вялікія.

Актыўнасьць калгасных мас партыйная ячэйка накіравала па паляпшэньне гаспадаркі. **Калгасьнікі ўнесьлі рад рацыяналізатарскіх прапаноў** у галіне разьвіцьця калгаснай вытворчасьці.

Рост гаспадаркі даў магчымасьць прыступіць да будаўніцтва новай аборы на 100 кароў, якая павінна быць скончана да 1-га лістапада. Партыйная ячэйка **дала жорсткі адпор апартуністычным разважаньням** аб недахопе будаўнічых матар'ялаў і ўсе меры прыняла да выкорыстаньня ўнутраных рэсурсаў (салома, дубцы і г. д.). І гэта новая абора, якая зараз заканчваецца будаўніцтвам будзе каштаваць не 20 тыс. рублёў як першая, а толькі 5 тысяч. Гэтага дабіўся калгас дзякуючы ўмелай рабоце і кіраўніцтва з боку партыйнай ячэйкі.

Ня гледзячы на тое, што калгас мае спэцыяльна малочны напрамак, добра пастаўлена і галоўля сьвіней. Зараз налічваецца ў калгасе каля 50 сьвінаматак і 100 шт. падсьвінкаў. Для сьвіней пабудаваны сьвінарнік па тыпе амэрыканскага.

Ячэйка сваячасова паставіла пытаньне аб падрыхтоўцы жывёлы да зімоўкі. Складзен кармавы балянс, падабрана брыгада па доглядзе жывёлы, распрацоўваецца пытаньне аб удасканаленьні арганізацыі працы на фэрме.

Калгас «Чырвоная Жэжліна» перавыканаў плян здачы малака. Замест 29 тыс. літраў прадуглежаных па пляне, здана 34500 літраў.

Уборачная і асенньня-пасеўная кампанія, **дзякуючы апэрацыйнаму кіраўніцтву з боку ячэйкі**, праведзена пасьпяхова. Ячэйка ўмела расставіла свае сілы па важнейшых рашаючых вучастках, па-бальшавіцку мабілізавала калгасьнікаў на пасьпяховае правядзеньне ўборачнай і пасеўнай кампаніі. У рэзультаце плян азімых у 200 га выкананы сваячасова і поўнасьцю. Да 20-га кастрычніка скончана ўборка бульбы з 70 гэктараў.

Да 1-га лістапада калгасьнікі мяркуюць поўнасьцю выканаць плян зяблева. У адказ на прамову **тав. Якаўлева** калгас прыняў рад самаабавязацельстваў па дастасаваньні агратэхнікі з мэтай павышэньня ўраджайнасьці. Адным з галоўных пунктаў самаабавязацельстваў зьяўляецца ўвядзеньне правільнага севазвароту.

У часе падрыхтоўкі да справаздачна-перавыбарчай кампаніі бюро ячэек жэжлінская ячэйка КП(б)Б павінна яшчэ больш павысіць сваю арганізатарскую ролю ў гаспадарча-вытворчым замацаваньні калгасу, павінна свой вопыт бальшавіцкага змаганьня перадаць астатнім калгасным ячэйкам раёну.

НА БАРАЦЬБУ ЗА ЯКАСЬЦЬ

сацыялістычнага ільнаканапляводзтва

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ПАСЕУ ТЭХКУЛЬТУР 1932 ГОДУ ВЫСОКАЯКАСНЫМ НАСЕНЬНЕМ

Загатоўчы апарат--на ільнаапрацоўчыя пункты. Змагацца за высокую якасьць валакна

Белільнасаюз зрывае загатоўку гатунковага насеньня тэхкультур

У барацьбе за лён у гэтым годзе атрыманы вялізарныя дасягненьні. Задачы пашырэньня сацыялістычнага ільнаводзтва ў наступным годзе ўключаюць у сябе ня толькі значнае пашырэньне плошчаў пад лён і канопліі. Першачарговай задачай зьяўляецца таксама ўзьняцьце вытворчасьці ільнаводчых гаспадарак, падвядзеньне новай тэхнічнай базы, укараненьне ўсіх заваёваньняў агратэхнікі.

Нарком земляробства СССР тав. Якаўлеў у сваім апошнім выступленьні вызначыў выразную праграму барацьбы за высокі ўраджай на аснове гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і саўгасаў.

Наша цэнтральная гаспадарчая арганізацыя яшчэ не мабілізавалася на выкананьне важнейшых указаньняў т. Якаўлева. Возьмем Белільнасаюз. Гэта арганізацыя дагэтуль не ўявіла важнейшага значэньня арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Пасобныя таварышы, падтрыманы партыйнай ячэйкай, у парадку сацыяпаборніцтва абвясьцілі паход за... голымі процантамі калектывізацыі. Праз пасьпецгазэту Белільнасаюзу абвяшчаюцца самаабавязацельствы і выклікі на арганізацыю... аднаго-двух-пяці калгасаў на кожнага супрацоўніка. Зразумела, такая пастаноўка пытаньня нічога супольнага ня мае з дырэктывамі партыі.

На запытаньне нашага супрацоўніка, што зроблена па рэалізацыі прамовы т. Якаўлева у адносінах укараненьня агратэхнікі ў саўгасы і калгасы, старшыня Белільнасаюзу тав. Вішнеўскі кажа, што апарат Белільнасаюзу «надзвычайна вузкі», што ў апараце ёсьць толькі два аграномы. На сыстэме Белільнасаюзу, паводле слоў тав. Вішнеўскага, таксама засталося толькі 5-6 аграномаў. Як бачыце, «аб'ектыўныя» прычыны не даваляюць (?) прыняць належных мер да рэалізацыі важнейшых дырэктыў Наркамзему СССР. Але за ўсім гэтым выразна відаць, што таварышы з Белільнасаюзу і ня чыталі прамовы тав. Якаўлева, прынамсі, і ня думалі аб вызначэньні канкрэтных мерапрыемстваў.

Тав. Вішнеўскі прыводзіць яшчэ адну «прычыну». У ільнаводных раёнах калектывізацыя перавысіла 50%, а ў Лепельскім, напрыклад, ужо 90 проц., а таму, на падставе пастановы НКЗБ, пытворчыя функцыі з Белільнасаюзу ліквідуюцца і ўскладаюцца на райкалгасаюзы. Белільнасаюз зараз мае толькі функцыі снабжэньня і загатовак.

Аднак, таварышы з Белільнасаюзу робяць вялікую памылку, не разумеючы таго, што функцыі снабжэньня і загатовак таксама маюць вялікае значэньне ў вырашэньні задачы пераўзбраеньня калгасаў і саўгасаў, не разумеючы, што гэта непасрэдна адносіцца на ўкараненьня агратэхнікі ў сацыялістычную сельскую гаспадарку.

Снабжэньне складаным машынамі, угнаеньнем, насеньнем і г. д. мае бясспрэчна вялікае значэньне. Але ў гэтых адносінах Белільнасаюз дзейнічае ўсыпляпую. Ён ня ведае, як скарыстоўваюцца машыны, угнаеньне, ён, нарэшце, ня ведае, як ідуць загатоўкі насеньня. У прыватнасьці, ад таго, як будуць праведзены загатоўкі ільнянога і канапляната насеньня, якой якасьці будзе гэтае насеньне,—у значнай меры будзе залежыць як пашырэньне плошчы пад лён і канопліі, так і павышэньне ўраджайнасьці.

А ў гэтым напрамку Белільнасаюз «дзейнічае» сапраўды ўсыпляпую. Плянаў загатовак ільнянога і канапляната насеньня няма зусім.

Лёзьнянскі і Сурасні раёны зьяўляюцца гадавальнікамі чыстагатункавага насеньня ільну-даўгунца. І гэтыя раёны таксама ня маюць пляну адбору насеньня.

Дырэктывы райкаапэнсаюзам даны агульныя: «адбіраць насенны матар'ял» а колькі—ня сказана. Загатоўкі ільнянога семя ў некаторых раёнах выжаныны на 57 і больш процантаў. З 21 ільнаводчага раёну, адбор насеннага матар'ялу робіцца толькі ў 11 раёнах, прычым у зусім нязначнай колькасьці. Напрыклад, Сурасні раён (гадавальнік высокагатункованага насеньня ільну) усяго загатовіў 623 з шалов. тоны, а адабраў для насеньня... 69 тон.

Белільнасаюз спасылаецца на тое, што НКЗБ ня даў плянаў. Гэта—не адгаворка.

Трэба канстатаваць, што адбор насеннага матар'ялу галебна зрываецца. Загатоўкі канапляната семя не пачаты. Усё гэта станіць пад удар забесьпячэньне пасеву 1932 году высокагатункованым насеньнем, г. зн. ня толькі ўзьняцьце ўраджайнасьці ільну, але і простае пашырэньне пасеўплошчы ільну і канапель сьвінцова пад пагрозу.

ЦКК РСІ і пракуратура рэспублікі павінны неадкладна высьветліць канкрэтных вінаватых у зрыве адбору гатункованага насеньня і прыцягнуць іх да суровай адказнасьці.

А. М.

За высокую якасьць валакна

Практыка працы ў мінулым годзе паказала, што якасьць ільну залежыць ня толькі ад ураджаю, але ў значнай меры і ад апрацоўкі. Аднэй і тэй жа гаспадаркай здаваўся лён розных гатункаў і не таму, што ўраджай розны, а з прычыны неадпаўкавай апрацоўкі. У асаблівасьці наглядалася здача ільну наогул фальсіфікаванага кулацка-заможнымі гаспадаркамі.

У радзе раёнаў дзяржаўнай інспэкцыяй па якасьці зафіксаваны рад выпадкаў, калі здача ільнаваланка рабілася ў выглядзе сырцу, часам проста ільняной саломай у памятным выглядзе. Кулацка-заможныя гаспадаркі, не жадаючы здаваць сваю прадукцыю дзяржаве, ужываюць спосаб штучнага павышэньня вагі і наўмыснага пагаршэньня якасьці.

Такім чынам лён добра не апрацоўваўся і здаваўся на загатоўчыя пункты з кастрыкам да 40-50 проц. Загатоўчыя арганізацыі на гэта не аварачалі належнай увагі. Замест рэальнага выкананьня плянаў загатоўкі ільну, у зводках і кастрыку залосілі ў графу «ільну», каб штучна павысіць процант выкананьня пляну загатовак. З гэтым трэба бязьлітасна змагацца.

Наркамснаб СССР пастанавіў у кароткі тэрмін стварыць па мясцох тэхнічныя камісіі па якасьці валакна, якія павінны займацца, у першую чаргу, устанаўленьнем стандартных узораў валакна. Па гэтых узорах павінна ісьці прыёмка ільну на ільназаводах і загатоўчых пунктах. Але ня толькі вызначэньне стандартаў уваходзяць у круг дзейнасьці мясцовых тэхнічных камісій. Яны павінны сачыць за якасьцю прыёмкі валакна, правільнай расцэнкай і г. д. Яны павінны павесьці работу сярод калгасных і адпаасобных бядняцка-сераднякіх гаспадарак, прапагандуючы лепшыя спосабы апрацоўкі ільну; яны павінны арганізаваць барацьбу за якасьць валакна, супроць фальсіфікацыі.

Абежнікам Наркамгандлю СССР прапанавана ў выпадку выяўленьня фальсіфікаванага валакна на загатоўчых пунктах прымаць рашучыя меры да вінаватых, прыцягваючы іх да крымінальнай адказнасьці. Гэты абежнік павінен быць вядомы ўсім загатоўшчыкам.

Між тым, загатоўчыя арганізацыі вядуць недастатковую барацьбу з фальсіфікацыяй.

Узьняцьце якасьці валакна — важнейшая задача ў пераапрацоўцы ільну і канапель. Кожны сартоўшчык ільну на загатоўчых пунктах і ільнабазах абавязан выехаць у калгас, ці саўгас для непасрэднага ўдзелу ў першапачатковай пераапрацоўцы ільну. Загатоўшчыкі разам з мясцовымі арганізацыямі павінны кіраваць барацьбой за падняцьце якасьці прадукцыі, напрыклад, чыстае трапаньне, правільнае сартаваньне, зьвязка і г. д. Ільнабазы, зьяўляючыся кантрольна-сартовачнымі пунктамі, ні ў якім разе не павінны абмяжоўвацца толькі прыёмкай і адпраўкай валакна, яны павінны весьці шырокую масавую працу, павінны растлумачваць здатчыкам, якім шляхам паляпшаецца якасьць валакна.

Ніжэй мы пералічаем асноўныя дэфэкты ільну, з якімі трэба рашуча змагацца.

Пухлявае і путанае валакно дае меншы процант чосанага ільну, таму што значная колькасьць валакна адыходзіць у вачосе. Такі лён бракуецца ў больш нізкія гатункі, чым ён заслугоўваў бы па сваёй якасьці.

Прысуха, або мёртвая кастрыка, таксама значна зьніжае якасьць валакна. Гэты недахоп залежыць ад недалежкі ці недамочкі валакна.

Падмочка ільну шкодна адбіваецца на валакне, яно траціць частку сваёй моцнасьці і тады, калі лён не пасьпеў яшчэ, папрэе.

Самую вялікую ўвагу сартоўшчык павінен сьвяртаць на засьмечанасьць ільну, фальсіфікацыю і пабочныя прымесі.

Загатоўчы апарат павінен выступіць на рашучую барацьбу за якасьць валакна. Сваячасовае і шырокае разгортваньне растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў забясьпечыць зьніжэньне ўсіх гэтых дэфэктаў. Увядзеньне аплаты загатавіцеляў у залежнасьці ад колькасьці і якасьці загатоўленай прадукцыі зьяўляецца абсалютнай неабходнасьцю.

Посьпех у барацьбе за якасьць валакна будзе забясьпечан тады, калі гэтай барацьбе будзе надан сапраўды грамадзкі характар.

Дзяржінспэктар Наркамснабу СССР па якасьці ільнавалакна

ВАЙХАНСКІ.

Выкараніць не бальшавіцкія прыёмы, перабудаваць работу

ЦК УсеКП(б) і СНК у сваёй адозьве далі разгорнутую праграму барацьбы за сацыялістычную жывёлагадоўлю. Рэалізаваць гэту балявую праграму магчыма толькі шляхам актыўнага ўдзелу ўсёй савецкай грамадзкасьці, усіх працоўных і ў першую чаргу непасрэдных работнікаў жывёлагадоўчых раёнаў, саўгасаў і калгасаў.

Гэта зразумелі камсамольцы і маладыя рабочыя сьвінагадоўчага саўгасу (Аршанскчына) імя «Комсомольской правды».

У адказ на адозву ЦК і СНК рабочая моладзь гэтага саўгасу зьвярнулася да ўсіх камсамольцаў і маладых рабочых сьвінагадоўчых саўгасаў Саюзу з канкрэтнай надзвычай важнай прапановай — ДАВЕСЬЦІ КОЖНЫ АПАРОС У 6-МЕСЯЧНЫМ УЗРОСЬЦЕ ДА АДНЭЙ ТОНЫ ВАГІ.

Няма асаблівай неабходнасьці даказваць, якое ВЯЛІКАЕ ПРАКТЫЧНАЕ І ПАЛІТЫЧНАЕ значэньне мае гэта прапанова.

З практыкі сьвінагадоўчых саўгасаў БССР вядомы не адзінкавыя факты, калі з-за дрэннага догляду, няправільнага кармленьня 30-40 проц. апаросу гіне, не дажыўшы да 2-3 месяцаў.

Саўгас імя «К. П.» выступіў у якасьці ЗАСТРЭЛЬШЧЫКА ў барацьбе за поўнае захаваньне апаросу. І што самае галоўнае, рабочыя саўгасу на практыцы ДАВЯЛІ ПОЎНУЮ МАГЧЫМАСЬЦЬ выкананьня сваёй прапановы.

Зьмяшчаючы гэтую адозву «Комсомольская правда» выступіла з заклікам да ўсіх рабочых сьвінагадоўчых саўгасаў РАЗГАРНУЦЬ УСЕСАЮЗНАЕ СПАБОРНІЦТВА НА «ТОНУ АПАРОСУ».

Пачын камсамольцаў і маладых рабочых саўгасу і заклік ЦО УсеЛКСМ павінна, была, здавалася, У ПЕРШУЮ ЧАРГУ ПАДХАПІЦЬ камсамольская газэта ЦК ЛКСМБ «Чырвоная зьмена». Гэта тым больш ЗАКОННА было чакаць ад «Ч. З.» таму, што яна мясной праблемай займалася наогул ад выпадку да выпадку.

Аднак, «Чырвоная зьмена» ЎПАРТА І НА ПРАЦЯГУ ДОЎГАГА ЧАСУ абыходзіла моўч і каштоўнейшы пачын перадавікоў жывёлагадоўлі.

Паўстае законнае пытаньне: ЧАМУ? На гэтае пытаньне даў зусім ясны адказ агляд «Ч. З.» «Комсомольской правдой».

Не жадаючы падхапіць пачын перадавікоў і зрабіць яго здабыткам мас у барацьбе за сацыялістычную жывёлагадоўлю, «Ч. З.» стала на шлях ФАБРЫКАЦЫІ КОНТР-ІНІЦЫЯТЫВЫ, НА ШЛЯХ ГНІЛОЙ КАНКУРЭНЦЫІ.

У нумары ад 20 верасьня «Ч. З.» зьмясьціла «Адозву рабочых сьвінагадоўчых саўгасаў, фэрм і калгасьнікаў Аршанскага раёну», якая НІЯКАЙ НАРАДАЙ НЕ АБМЯРКОЎВАЛАСЯ І НІКІМ НЯ ПРЫМАЛАСЯ.

Аказваецца, што гэта адозва была СФАБРЫКАВАНА адным з работнікаў аршанскай газэты «Ленінскі прызыў» і даслана ў рэдакцыю работнікам «Ч. З.» тав. СІДАРУКОМ.

Ведаючы гісторыю гэтага дакументу, г. зн. ведаючы аб бруднай фабрыкацыі адозвы, Сідарук на працягу доўгага часу маўчаў.

ЧАМУ ГЭТА ТАК? АДКУЛЬ, З ЯКОГА АРСЭНАЛУ МАЛАДЫ ГАЗЭТНЫ РАБОТНІК ВЫЛУЧЭНЕЦ УЗЯЎ ПАДОБНЫЯ ПРЫЁМЫ І МЭТАДЫ РАБОТЫ?

Расшыфроўцы гэтае пытаньне паддаецца толькі тады, калі прааналізаваць мэтады і прыёмы, якія ў такіх выпадках ужываліся кіраўніцтвам «Чырвонай зьмены».

Бюро ЦК ЛКСМБ, разгледзеўшы агляд друку «Ч. З.» «Комсомольской правдой» канстатуе, што «ТАВ. ПЛАТАЎ, БУДУЧЫ РЭДАКТАРАМ «Ч. З.» ДАПУСЬЦІЎ У РАБОЦЕ РАД ПАЛІТЫЧНЫХ ПАМЫЛАК, НА ШТО БЮРО ЦК УКАЗВАЛА, УЖЫВАЎ МЭТАДЫ ЧУЖЫЯ БАЛЬШАВІЦКАМУ ДРУКУ (СЭНСАЦЫЯ), СФАБРЫКАВАЎ ДАКУМАНТ ПАД ЗАГАЛОЎКАМ «Я ЗА ТЭХНІЧНЫ КАРАНТЫН, АЛЕ З ДАДАТКАМІ», ЗА ПОДПІСАМ ІНЖЫНЭРА ІВАНОВА, ЗЬМЕСТ ЯКОГА ЗВОДЗІЎСЯ ДА САМАХВАЛЬСТВА ГАЗЭТЫ».

Такім чынам, прыём, ужыты Сідаруком, ВЫНІКАЕ З ТЭЙ СЫСТЭМЫ бахвальства, канкурэнцыі, сэнсацыі, якімі падмяняла кіраўніцтва газэты масавую арганізатарскую і апэрацыйную работу.

Так здарылася НЯ толькі ў сувязі з выступленьнем камсамольцаў і рабочай моладзі сьвінагадоўчага саўгасу. Такі лёс напаткаў даволи каштоўнае пачынаньне, якое зрабіла сама «Ч. З.».

У даным выпадку мы маем на ўвазе прапанову газэты аб стварэньні тэхнічнага карантыну для новапрыходзячых на прадпрыемства рабочых.

Прапанова блазумоўна ВАРТАЯ ЎВАГІ. Але яна не дайшла да фабрыкі, да заводу, ня была прадмэтам абгаварэньня камсамольцаў і шырокіх рабочых мас.

ЧАМУ? Зноў-жа таму, што выносячы гэту прапанову на старонкі газэты, рэдакцыя НЯ ВЫХОДЗІЛА З ДЗЕЛАВЫХ МЕРКАВАНЬНЯЎ, А ВЫКЛЮЧНА БІЛА НА СЭНСАЦЫЮ, НА «АРЫГІНАЛЬНАСЬЦЬ ІНІЦЫЯТЫВЫ».

Выходзячы іменна з гэтых меркаваньняў газэта не правяла масавай арганізатарскай работы для таго, каб ажыцьцявіць сваю-ж прапанову. Замест гэтага ў «Ч. З.» у тым-жа нумары ад 20 верасьня зьявіцца сфабрыкаваны рэдакцыйным работнікам артыкул «Я за тэхнічны карантын, але з дадаткамі» за подпісам няіснуючага інжынэра Іванова».

Няма патрэбы падрабязна спыняцца на зьмесьце гэтага артыкулу. Скажам толькі, што бахвальства, якім запоўнены з агульнага ланцугу пагоні за сэнсацыяй.

Такім чынам, пагоня за «бляскам гузікаў мундзіру гонару», канкурэнцыя ЗАЦЯМНІЛІ ў галавах кіраўніцтва рэдакцыі пачуцьцё партыйнай адказнасьці за разгортваньне сацыялістычнай жывёлагадоўлі, за рэалізацыю пёзунгу «аўладаць тэхнікай», за ажыцьцяўленьне цэлага раду другіх задач.

Гэтыя факты між іншым даюць тлумачэньне таму, чаму ў свой час у «Ч. З.» зьяўляюцца «карэктывы да агляду друку» газэтай пастановы рабселькораўскага зьезду, чаму юнкоры «Ч. З.» у такім пытаньні, як барацьба за грамадзкае харчаваньне пазбаўлены падтрыманьня газэты.

ВІДАВОЧНА, ШТО Ў ДАНЫМ ВЫПАДКУ КІРАЎНІКІ РЭДАКЦЫІ «Ч. З.» У СВАЁЙ РАБОЦЕ КАРЫСТАЛІСЯ МЭТАДАМІ, ЯКІЯ НІЧОГА АГУЛЬНАГА НЯ МЕЛІ З ПРЫНЦЫПАМІ БАЛЬШАВІЦКАГА ДРУКУ.

Ва ўсёй гэтай справе сумную ролю адыграла бюро ячэйкі КП(б)Б выдавецтва «Ч. З.». Замест выкрыцьця сутнасьці мэтадаў, якія ўжываліся кіраўніцтвам рэдакцыі, замест сыгналізацыі аб іх поачэйкі стала на шлях пасьўнага наглядальніка гэтых агідных фактаў.

Ясна пасьля гэтага, што як у ячэйцы, так і ў калектыве работнікаў НЯ БЫЛА РАЗГОРНУТА САМАКРЫТЫКА. Толькі гэтым можна вытлумачыць факт адсутнасьці на працягу доўгага часу сыгналаў аб мэтадах, што ўжываліся кіраўніцтвам рэдакцыі.

Справа «Чырвонай зьмены» павучальна ў тым сэнсе, да чаго можа давесьці ПРАКТЫКА ПАДМЕНЫ АРГАНІЗАТАРСКАЙ АПЭРАЦЫЙНАЙ РАБОТЫ ГОЛАЙ СЭНСАЦЫЯЙ, ФАНФАРОНСТВАМ, ПАГОНЯ ЗА «АРЫГІНАЛЬНАЙ ФОРМАЙ» НА ШКОДУ ДЗЕЛАВЫМ ПАРТЫЙНЫМ МЕРКАВАНЬНЯМ.

ЦК ЛКСМБ зьняў з работы т.т. Платава і Сідарука. Бюро парткалектыву расьпусьціла бюро партыйнай ячэйкі выдавецтва «Ч. З.».

Даны вычарпальныя паказаньні аб канкрэтных задачах у далейшай рабоце ЦО ЛКСМБ.

Новае кіраўніцтва і новавыбранае бюро партыйнай ячэйкі павінны цэнтральнай задачай у дзейнасьці рэдакцыі паставіць АРГАНІЗАТАРСКУЮ РАБОТУ, разьвіцьцё ударніцкага руху сярод юнкораў, правядзеньне СЫСТЭМАТЫЧНАЙ масавай работы, разгортваньне БАЛЬШАВІЦКАЙ САМАКРЫТЫКІ як на старонках газэты, так і ў рабоце рэдакцыйнага калектыву.

Толькі пры гэтых умовах «Чырвонай зьмена» зможа выправіць дапушчаныя грубыя памылкі і забясьпечыць сапраўды балявую работу па вырашэньні жывёлагадоўчай праблемы, па рэалізацыі ўсіх тых вялізарных задач, што ўскладзены партыяй на друк.

К

Агляд друку

Не забываць аб галоўным

БАРАЦЬБА ЗА ЯКАСЬЦЬ—ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗАДАЧА Ў РАБОЦЕ ШКОЛ

„Камунар Магілёўшчыны", „Калгасьнік Старобіншчыны" і „Калектывіст" (Чэрвень)

Нерамагчы адсталаньне тэмпаў культурнага будаўніцтва ад усё ўзрастаючых тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, узьняць якасьць работы нашай школы, дабіцца поўнага задавальненьня культурных запатрабаваньняў рабочай клясы і працоўных мас, — у гэтым бачыцца задача дня.

У барацьбе за павышэньне тэмпаў культурнага будаўніцтва, за паляпшэньне работы навучальных устаноў вялікая роля належыць друку як цэнтральнаму, так і раённаму.

Задача зараз заключаецца ў тым, каб на ўсіх, і ў першую чаргу на галоўнейшых вучастках гэтага фронту разгарнуць баявую, сапраўды ударную работу.

Падрыхтоўка да навучальнага году, барацьба за поўнае выкананьне пляну ўсенавучу і ліквідацыі няпісьменнасьці, за савецкую палітэхнічную школу, за якасьць навучаньня ва ўсёй сыстэме народнай асьветы — зьяўляецца важнейшым вучасткам культурнага фронту.

Гэтага, як відаць, не ўразумела рэдакцыя «Камунара Магілёўшчыны». Газэта амаль не займалася падрыхтоўкай да навучальнага году. Зьмясьціўшы 12 жніўня пастанову штабу па правядзеньні двухдэкадніка трывогі на культурным фронце, «К. М.» пра навучальны год успамінае толькі праз 10 дзён. І толькі 26 жніўня газэта ра ўсю шырыню паставіла пытаньне аб навучальным годзе. Прысьвечаныя гэтаму дзьве паласы палкам запоўнілі матар'ялам рэйду ўдарных брыгад.

На грунце гэтых матар'ялаў «Камунар Магілёўшчыны» за 5 дзён да пачатку навучаньня вымушан канстатаваць, што:

«Падрыхтоўка да навучальнага году ў нашым раёне разгорнута недапушчальна спаба. Такім чынам, пачатак навучальнага году пастаўлен пад простую пагрозу зрыву».

Другога вываду, бясспрэчна, зрабіць было нельга, бо будаўніцтва і рамонт школ з-за бескантрольнасьці праводзіліся зусім марудна, шмат школ не забясьпечаны настаўніцтвам, у радзе сельсаветаў не праведзен улік дзяцей школьнага ўзросту, а таксама няпісьменнага і малапісьменнага насельніцтва.

Газэта такое становішча тлумачыць тым, што ў адносінах да культурнага будаўніцтва «раду раённых устаноў і арганізацый пануе апартуністычны халадок».

Гэта ацэнка будзе зусім правільнай толькі тады, калі да «раду раённых устаноў і арганізацый» дадаць і рэдакцыю «Камунара Магілёўшчыны», якая забіла трывогу толькі за 5 дзён да пачатку навучальнага году.

Што справа абстаіць ня інакш мы яшчэ больш упэўнімся, калі прасочым за далейшым асьвятленьнем газэтай пытаньняў навучальнага году. Кіруючыся апартуністычным мярылам аб чарговасьці кампаній, «Камунар Магілёўшчыны» толькі мімаходам закранае пытаньне навучальнага году ў нумарох ад 3 і 10 верасьня і з уласьцівай ёй у гэтых адносінах забыўлівасьцю не ўспамінае пра матар'ялы рэйду.

Газэта не праверыла таго, як цэлы рад арганізацый і ўстаноў рэагавалі на матар'ялы рэйду, ці ліквідаваны тыя прарывы, аб якіх пісалі ўдарнікі «К. М.».

Разам з тым, з кругавіду газэты выпалі важнейшыя моманты школьнага будаўніцтва.

«Камунар Магілёўшчыны» па сутнасьці не змагаецца за палітэхнізацыю, не закранае мэтадычнай работы, абыходзіць пытаньне якасьці навучаньня ў школах. І да сёньняшняга дня газэта не папулярызавала пастановы ЦК УсеКП(б) («Зьвязда», 7 верасьня) аб сярэдняй і пачатковай школе.

Пра гэты палітычна важнейшы дакумант чытач «К. М.» даведваецца толькі з кастрычніка.

Як-жа падаецца гэты матар'ял?

Зьмяшчаючы падборку пад «шччкай» «Пастанова ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе ігнаруецца», рэдакцыя не палічыла патрэбным сказаць аб асноўных пунктах гэтай важнейшай пастановы.

Замест растлумачэньня сутнасьці пастановы ЦК, замест мабілізацыі мас на выкананьне задач, якія пастаўлены гэтай пастановай, «К. М.» апарашвае чытача многазначнай «шчакай», пад якой зьмяшчаецца тры заметкі аб дэзэртырстве двух настаўнікаў і дрэнным будаўніцтве адной школы.

Хіба ў гэтым галоўнае?

Бязумоўна, патрэбна змагацца супроць фактаў дэзэртырства настаўнікаў, і патрэбна змагацца і за якасьць будаўніцтва. Але абыходзіць пытаньне якасьці навучаньня і задачы палітэхнізацыі школы, што высунуты пастановай ЦК як галоўнае ў радзе сярэдняй і пачатковай школы,—гэта значыць сьвядома, альбо несьвядома дэзарыентаваць раённыя і нізавыя арганізацыі і чытача ў сутнасьці пастаўленых цэнтральным камітэтам задач.

Недаацэньваючы культурнага будаўніцтва наогул, газэта недаацаніла такіцтва наогул, газэта недаацаніла такіцтва наогул, газэта значэньне пастановы ЦК УсеКП(б) аб школе.

«Сельсаветы і нізавыя партарганізацыі,—падкрэсьлівае «К. М.», — на справу навучаньня ўсё яшчэ гляджаць як на другарадную справу, якая іх не датычыцца.

Рэдакцыя «Камунара Магілёўшчыны» павінна зразумець, што вялікая доля віны за такое становішча ляжыць у першую чаргу на ёй.

Калі «Камунар Магілёўшчыны» ўсё-ж

УЗОРНА ПРАВЕСЬЦІ ПЕРАВЫБАРЫ ФЗМК

1-га лістапада—Усебеларускі зьлёт гаспадарча-разрахунковых брыгад

Узмацненьне і пашырэньне брыгаднага гаспадарчага разрахунку—адна з асноўных задач перавыбарчай кампаніі ФЗМК

(Пастанова прэзыдыуму ЦСПСБ аб выкананьні дагавору з Заходняй вобласьцю па ўкараненьні сацыялістычна-гаспадарчых разьліковых брыгад).

Прэзыдыум ЦСПСБ канстатуе, што за апошні час ўпарасна значная колькасьць гаспадарча-разьліковых брыгад на прадпрыемствах БССР (286 брыгад на 10-га кастрычніка).

Разам з гэтым прэзыдыум ЦСПСБ адзначае, што да ранае месц работа гаспадарчых разьліковых брыгад пастаўлена не на належную вышыню.

Асноўным недахопам зьяўляецца адсутнасьць уліку эфэктыўнасьці працы брыгад.

У пасобных саюзах (мясарыбным, сувязі, мастацтва, грамадзкага харчаваньня і асьвіты ў сельска-гаспадарчых саюзах, МТС і батраку, жывёлагадоўчых саўгасах) зусім пачата работа па ўкараненьні гаспадарча-разьліковых брыгад.

Выходзячы з гэтага, прэзыдыум ЦСПСБ пастанаўляе:

1) Усім прафарганізацыям, асабліва ЦК саюзаў, якія да гэтага часу не разгарнулі работы па ўкараненьні сацыялістычна-гаспадарчых разьліковых брыгад, зараз-жа прыступіць да правядзеньня работы ў гэтым напрамку.

2) З тэй прычыны, што ў гаспадарча-разьліковых брыгадах адсутнічае патрэбны ўлік эфэктыўнасьці, што не дае стымулу для палепшэньня працы і далейшага ўкараненьня гаспадарча-разьліковых брыгад — прапанаваць сэктару вывучэньня формы ўліку працы гэтых брыгад на заводзе «Сьвятлана» і вопыт працпрацаваць на нарадах гаспадарча-разьліковых брыгад.

3) Ня гледзячы на пастанову сакратарыяту аб скліканьні па гарадох: Менску, Віцебску, Гомелі, Барысаве і Рэчыцы зьлётаў гаспадарча-разьліковых брыгад, падрыхтоўчай работы да зьлётаў не праводзіць. Прапанаваць выпешпаказальным гарпрафсаветам склікаць гэтыя зьлёты не пазьней 25-га кастрычніка.

4) Арганізаваная радыё-перакліч для абмену вопытам работы гэтых брыгад амель была сарвана на віне Гомельскага, Віцебскага, Рэчыцкага ГСПС і ФЗМК — абутковай фабрыкі «Праца» — Гомель, «Х Кастрычнік» — Рэчыца.

5) Прэзыдыум ЦСПСБ паказвае старшым гэтых ГСПС на недапушчальныя адносіны да алтэй з вышэйшых форм сацпаборніцтва і ўдарніцтва, накіраваў для забесьпячэньня выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну.

6) Для абмену вопытам работы гаспадарча-разьліковых брыгад на БССР, склікаць зьлёт даных брыгад па БССР на 1-га лістапада з наступнай абвесткай дня; 1) Задачы гаспадарча-разьліковых брыгад, 2) інфармацыя з месц.

7) Паставіць перад ВСНГВ пытаньне аб дачы дырэктывы гаспадарчым арганізацыям, аб правільнай арганізацыі ўліку эфэктыўнасьці гаспадарча-разьліковых брыгад, з мэтай актыўнага ўдзелу ў падрыхтоўцы і правядзеньня зьлётаў.

8) Фабрычна-заводзкі, цэнтральны і мясцовы друк невыстарчальна асьвятлялі пытаньне ўкараненьня і працы існуючых сацыялістычна-гаспадарчых разьліковых брыгад. Прапанаваць ФЗМК забясьпечыць шырокае асьвятленьне гэтага пытаньня на старонках пматтыражак і насьценгазэт, а таксама дасылаць матар'ялы ў мясцовы і цэнтральны друк.

Менскі прафактыў мабілізаваны

паказаць узоры баявой работы па перавыбарах ФЗМК

(Пастанова менскага агульна-гарадзкога сходу прафактыву)

Заслухаўшы даклад аб перавыбарах пазаных прафарганізацый, агульна-гарадзкі сход прафактыву гор. Менску адзначае:

1. Перавыбары ФЗМК, зьяўляючыся масавай палітычнай кампаніяй і супадаючы з падрыхтоўкай да XIV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, гадавіны вызваленьня посьпехаў рабочай клясы пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі ў барацьбе за сацыялізм, а таксама з вялікімі задачамі IV кварталу рашаючага году пяцігодкі — набываюць выключнае палітычнае значэньне і патрабуюць максімальнай увагі да перавыбараў ФЗМК усёй пралетарскай грамадзкасьці.

2. Адозва УсеЦСПС, якая зьяўляецца важнейшым палітычным дакумантам, а усёй яскравасьцю ставіць перад прафсаюзамі, у тым ліку прафарганізацыямі Менску, рад баявых задач, якія патрабуюць бездакладнай мабілізацыі мас на сваячасовае і пасьпяховае іх выкананьне.

3. Адозва УсеЦСПС зусім правільна адзначае, што, побач з буйнейшымі посьпехамі... «практычная работа прафсаюзаў усё яшчэ значна адстае ад задач, якія высоўваюцца новым этапам сацыялістычнага будаўніцтва»... і гэтае адставаньне перш за ўсё вызначаецца ў слабым правядзеньні ў жыцьцё 6-ці ўмоў тав Сталіна, у непраяўленьні дастатковай настойлівасьці і ініцыятывы ў скарыстаньні ўсіх магчымасьцяй, якія ёсьць для далейшага палепшэньня матар'яльнага і бытавога становішча рабочай клясы.

4. Выходячы з усяго паказанага, перавыбары павінны прайсьці пад знакам мабілізацыі шырокіх рабочых мас на выкананьне паказаньняў тав. Сталіна ў справе ліквідацыі абязьлічкі і ўраўнілаўкі, арганізацыі і ўзмацненьні брыгад гаспадарчага разьліку, ажыцьцяўленьня сапраўднага гаспадарчага разьліку ў цэху, жорсткай барацьбы з прагуламі, пастоямі, цякучасьцю. Перавыбары павінны забясьпечыць разгортваньне работы па палепшэньні матар'яльнага і бытавога абслугоўваньня рабочых мас, па перанясеньні вопыту буйнейшых прадпрыемстваў СССР па палепшэньні грамадзкага харчаваньня, работы кааперацыі. Правядзеньне перавыбараў павінна суправаджацца праверкай і ўзмацненьнем інтэрнацыянальнай масава-выхаваўчай работы, у асаблівасьці з новымі кадрамі рабочых.

5. Сход прафактыву падкрэсьлівае, што перавыбары павінны яшчэ больш мабілізаваць увагу прафарганізацый на далейшую перабудову работы прафсаюзаў у адпаведнасьці з задачамі, пастаўленымі тав. Сталіным і ўказаньнямі V пленуму УсеЦСПС. Поўная рэалізацыя гэтых задач і ўказаньняў—вось лёзунг перавыбараў ФЗМК.

6. Улічаючы ўсю неабходнасьць забясьпячэньня поўнага і пасьпяховага ажыцьцяўленьня адозвы УсеЦСПС, забясьпячэньня ажыцьцяўленьня ўказаньняў аб чым, што перавыбары павінны... «выклікаць новую хвалю ўдарніцтва, уздым сацыялістычнага спаборніцтва, рост прафсаюзнага членства, павялічэньне кадраў добраахвотніцкага актыву...» (з адозвы УсеЦСПС),—прафактыў гор. Менску АБВЯШЧАЕ ПОЎНАСЬЦЮ СЯБЕ МАБІЛІЗАВАНЫМ НА ПЕРАВЫБАРЫ ФЗМК і ўхваляе пастанову прэзыдыуму ГСПС аб правядзеньні перавыбараў мэтадамі шырокага сацыялістычнага спаборніцтва, і выклік на сацспаборніцтва Гомельскага і Смаленскага ГСПС.

7. Сход прафактыву абавязуецца і прапануе ўсім прафарганізацыям Менску поўнасьцю забясьпечыць сапраўднае ажыцьцяўленьне пастановы XVI гарэзьезду аб тым, што: «адзнай з важнейшых умоў пасьпяховасьці перабудовы работы прафсаюзаў, зьезд лічыць забясьпячэньне сапраўднай прафсаюзнай дэмакратыі, шырокае разгортваньне пралетарскай самакрытыкі, якая зьяўляецца лепшай праверкай зьнізу працездольнасьці прафапарату і яго кіруючых кадраў». Гэта дырэктыва XVI партзьезду павінна быць пакладзена ў аснову ўсёй перавыбарчай кампаніі ФЗМК.

8. Сход прафактыву падкрэсьлівае, што асаблівая ўвага павінна быць зьвернута падбору і выпучэньню ўдарнікаў на кіруючую работу ФЗВ, на рашучае ўцягненьне жанчын і моладзі, забясьпечваючы якасны падбор складу новаабраных нізавых прафарганізацый.

9. Сход заклікае ўсе прафарганізацыі Менску і БССР паказаць узоры баявой работы па перавыбарах ФЗМК. Перавыбары, як сур'ёзная баявая палітычная кампанія, павінна прайсьці пад знакам барацьбы за генэральную лінію партыі, за выкананьне задач 3-га рашаючага.

Пастанова камісіі выкананьня пры СНК БССР

ПРА ВЫКАНАНЬНЕ ДЫРЭКТЫЎ ЦК КП(б)Б І СНК БССР

Аб арганізацыі ўкамплектаваньні і разьвіцьці малочных і сьвінагадоўчых таварных фэрм

Выслухаўшы даклады ўпаўнаважанага Малакокалгасцэнтру т. Грышевіча, нам. упаўнаважанага Сьвінаводкалгасцэнтру т. Номаля, Сельгасаб'яднаньня Белкаапсаюзу т. Вайсовіча і судакладчыка прадстаўніка НК РСІ т. Бабака, Камісія выкананьня ўстанаўляе, што ва ўкамплектаваньні стада таварных калгасных фэрм ёсьць значныя дасягненьні: ў малочна-таварных фэрмах пастаўлена 110.404 штук буйной рагатай жывёлы, а іх 65,274 кароў, а ў сьвінагадоўчых таварных фэрмах пастаўлена 63,965 сьвінаматак, але разам з гэтым ёсьць і вялікія недахопы ў будаўніцтве, стварэньні кармовай базы, утрыманьні, правільным кармленьні і доглядзе жывёлы.

Пералічаныя арганізацыі ня выканалі пастаноў ЦК КП(б)Б і СНК БССР па змаганьні з эпізоатыямі і па арганізацыі працы ў калгасных таварных фэрмах.

Для зьнішчэньня адзначаных недахопаў, камісія выкананьня пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць Народны Камісарыят Зямляробства, пад адказнасьць тав. Масюкова, Беларускія Аддзяленьні Сьвінаводкалгасцэнтру і Малакокалгасцэнтру, пад адказнасьць т. т. Красоўскага і Грышевіча, Сельскагаспадарчае Аддзяленьне Белкаапсаюзу, пад адказнасьць тав. Вайцаховіча, загадчыкаў раённых земельных аддзелаў, загадчыкаў малочных і сьвінагадоўчых калгасных таварных фэрм і раённых калгассаюзы, пад адказнасьць іх старшынь:

а) правесьці канкрэтныя мерапрыемствы для арганізацыйнага замацаваньня малочных і сьвінагадоўчых таварных фэрм, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на ўзбудаваньне фэрм і павялічэньне іх таварнасьці;

б) поўнасьцю ў IV квартале выканаць плян камплектаваньня стада фэрм;

в) на працягу дэкады закончыць складаньне кармавых балансаў таварных фэрм забясьпечыўшы своячасовае і поўнае выкананьне плянаў загатовак адпаведных культур і да 5 лістапада 1931 г. стварыць кармавыя фонды, якія ў поўнай меры забясьпечылі кармамі жывёлу на таварных фэрмах;

г) закончыць пачатае будаўніцтва на фэрмах не пазьней 15 лістапада 1931 году перавёўшы ўсю работу па будаўніцтве на прэміяльна-зьдзельную аплату;

д) выканаць дырэктывы ўраду БССР па нармальным утрыманьні, кармленьні і доглядзе жывёлы, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на правядзеньне прафілактычных мерапрыемстваў у таварных калгасных фэрмах і поўнае выкананьне ветэрынарна-зоатэхнічных запатрабаваньняў. Кантроль за гэтым усі класьці на загадчыкаў раённых зямельных аддзелаў, усіх ветэрынарных работнікаў і раённых агранамаў.

Прапанаваць усім работнікам выканаўчых камітэтам зічаючых у ведамасьці гэтага прыцягваць да суворай адміністрацыйнай і судовай адказнасьці.

2. Прызнаючы зусім недапушчальным, што няма сталага падліку на фэрмах, абавязаць Народны Камісарыят Зямляробства, пад адказнасьць т. Сакалова і Бел. Аддзяленьня Сьвінаводкалгасцэнтру і Малакокалгасцэнтру, пад адказнасьць т. т. Красоўскага і Грышевіча ў дэкадны тэрмін завесьці сталы падлік на таварных калгасных фэрмах наяўнасьці паталёўя, яго руху, здачы таварнай прадукцыі і г. д., дабіўшыся сталага і рэгулярнага апэрацыйнага падліку.

3. Даручыць Народнаму Камісарыяту Зямляробства і Белкалгасцэнтру ў дэкадны тэрмін распрацаваць формы аплаты працы на таварных калгасных фэрмах, якія б эканамічна зацікавілі абслугоўваючы персанал у выкананьні ўсіх правіл па доглядзе жывёлы, кармленьні яе, па выхадзе таварнай прадукцыі і выкананьні ветэрынарна-зоатэхнічных запатрабаваньняў і не пазьней 5 лістапада 1931 г. падаць на зацьвярджэньне СНК паркатычныя прапановы па гэтым пытаньні.

4. У лістападзе выслухаць на камісіі выкананьня даклады раду раённых выканаўчых камітэтаў, раённых калгасаюзаў і загадчыкаў калгасных таварных фэрм, а таксама праверыць выкананьне дырэктыў ураду па калгасных таварных фэрмах па пасобных пытаньнях: камплектаваньне, арганізацыя працы, утрыманьне і догляд жывёлы, здача таварнай прадукцыі, арганізацыя цялячых калгасных фэрм і г. д.

У сувязі з гэтым даручыць НК РСІ весьці і далей работу па праверцы дырэктыў аб арганізацыі і разьвіцьці малочных, сьвінагадоўчых і цялячых калгасных фэрм.

Нам. старшыні камісіі выкананьня пры СНК БССР А. КАЛНІН
Сакратар камісіі выкананьня пры СНК БССР Я. ЭЛЬКІН.

III УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД НАВУКОВЫХ РАБОТНІКАЎ

РАЗЬВІЦЬЦЮ НАВУКІ—БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ

З часу другога ўсебеларускага зьезду навуковых работнікаў прайшоў вялікі пэрыяд. III зьезд сабраўся ў заключным квартале рашаючага году пяцігодкі. Тры міжзьездаўскіх гады зьяўляюцца гадамі вялікіх перамог у будаваньні сацыялізму, дасягнутых на аснове генэральнай лініі партыі, ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы і барацьбы на два фронты ў навуцы.

За гэтыя гады пралетарыятам і працоўнымі масамі Савецкай Беларусі, пад кіраўніцтвам партыі, заваяваны вялізарнейшыя гістарычныя перамогі як на фронце капітальнага будаўніцтва, так і на культурным фронце. Да II зьезду навуковых работнікаў у БССР было толькі 4 ВНУ і 7 навукова-дасьледчых інстытутаў. Да III зьезду мы ўжо маем 26 ВНУ і 39 навукова-дасьледчых інстытутаў. Гэтыя лічбы, як ня трэба лепш, а усёй яскравасьцю гавораць аб росьце нашага нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Асноўная маса навуковых ды інжынэрна-тэхнічных сіл рашуча павярнулася тварам да вытворчасьці, уключаецца ў актыўную работу на будаўніцтве сацыялізму.

* * *

Вялікая аставала заля універсытэцкага гарадка заліта сьвяточным бляскам. Урачысты паток людзей — прафэсары, навуковыя работнікі, аспіранты, студэнты — цячэ з шырокіх калідораў і запаўняе рады.

* * *

Зьезд адкрывае старшыня ЦВ сэкцыі навуковых работнікаў БССР прафэсар Вальфсон. Ён у кароткай прамове падрэзьвае вынікі пройдзенага між зьездамі шляху, ставіць задачы, якія павінны быць вырашаны зьездам.

— У капіталістычных краінах,—кажа тав. Вальфсон,— навука ідзе на «залатым ланцугу» даляраў, фунтаў і марак, усё больш адкрыта і бессаромна лёкайскі выслужваецца перад сваімі імпэрыялістычнымі гаспадарамі і ўласьнікамі.

ТУТ, у пралетарскай краіне, навука становіцца на службу сацыялізму, уключаецца ў вялікую рэканструкцыю ўсёй народнай гаспадаркі, становіцца магутнай зброяй бальшавіцкай партыі па ажыцьцяўленьні лёзунгу «дагнаць і перагнаць» у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны.

Да нашага зьезду асноўная маса высока-кваліфікаваных работнікаў прыйшла згуртаванай вакол задач сацыялістычнага будаўніцтва, скінула з сябе ўсякую беспрынцыпную «аполітычнасьць», уключаецца ў актыўную работу па выкананьні пяцігодкі.

— У нашай вытворчасьці,—кажа далей т. Вальфсон,—любач з грандыёзнымі ня лікімі дасягненьнямі ёсьць недахопы, ёсьць яшчэ прарывы. Наш зьезд прызван ня толькі гаварыць аб дасягненьнях. Мы абавязаны пражэктарам бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі асьвятліць усе недахопы, якія ёсьць у навуковай рабоце і ў рабоце нашай сэкцыі з тым, каб гэтыя недахопы ў бліжэйшы час зьнішчыць і даць разьвіцьцю сацыялістычнай навукі бальшавіцкія тэмпы.

* * *

Прэзыдыум выбіраецца з 27 асоб. У яго уваходзяць т.т. Чарнушэвіч (ЦК КП(б)Б), Рыжоў (ЦСПСБ), Бамэль (ЦБ усесаюзнай сэкцыі навуковых работнікаў), Грысевіч, Вальфсон, Платун, Плятнёў, Пераход, Бэнэнк, Нікольскі, Пракапчук, Рыўлін, Сакалоўскі, Рубінчык, Саевіч, Прыляжаеў, Жаўтоўскі, Капазвіч і інш.

Пасьля выбару ганаровага прэзыдыуму, у які пад гучныя воплескі праходзяць: Палітбюро ЦК УсеКП(б), Тэльман, Ленскі, Гей, Шаранговіч, Гападзеў, прымаецца парадак дня і зьезд пераходзіць да дасладвай работы.

* * *

Па першым пытаньні парадку дня — справаздачны даклад ЦБ усесаюзнай сэкцыі навуковых работнікаў — выступіў тав. Бамэль.

Дакладчык робіць кароткі агляд крызісу капіталізму і процістаўляе шпаркаму развалу капіталістычнай сыстэмы бурны рост сацыялісычнага будаўніцтва ў СССР, рашаючыя перамогі, атрыманыя пралетарыятам Савецкага Саюзу..

Ахарактарызаваўшы тыя эрухі, якія адбыліся на аснове буйных дасягненьняў сацыялістычнага будаўніцтва, у масах старых навуковых работнікаў, паварот асноўнай масы старых навуковых і інжынэрна-тэхнічных работнікаў у бок актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве, тав. Бамэль дакладае пра становішча сэкцыі навуковых работнікаў:

— У 1928 годзе ўсесаюзная сэкцыя навуковых работнікаў налічвала 25.000 чалавек. На сёньняшні дзень мы выраслі ў 40-тысячную армію. Партыйна-камсамольская і работніцкая прослойка сярод навуковых работнікаў узрасла да 65 проц. агульнага ліку. У сэкцыі 20 проц. рабочых.

— Асноўныя задачы, — кажа тав. Бамэль, — нашай далейшай работы паказаны ў гістарычнай прамове тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў, а таксама ў прамовах т.т. Молатава, Куйбышава і Рудзутака пра плянаваньне навукі і тэхнікі.

Канкрэтна яны, гэтыя задачы, у асноўным зводзяцца да наступных: стварыць уласную навуковую і інжынэрна-тэхнічную інтэлігенцыю рабочай клясы; усямерна стварыць новыя ачагі падрыхтоўкі кадраў; рэканструкцыя ўсёй навуковай справы; укараненьне пляну ў працу навуковых работнікаў; мэтады сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва зрабіць мэтадамі ўсяе працы навуковых работнікаў; дапамагчы рабочай клясе як мага хутчэй аўладаць навукай і тэхнікай; уключыцца ў актыўную работу па правядзеньні ўсеабучу і політэхнізацыі школы, па рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе; павярнуць навуку тварам да ўмацаваньня абароназдольнасьці СССР.

* * *

На ранішнім пасяджэньні зьезду разгарнуліся спрэчкі па дакладу тав. Бамэля.

— ЦБ сэкцыі навуковых работнікаў, —гаворыць прафэсар Пракапчук — на адным са сваіх пленумаў практычна прыступіла да перабудовы сваёй работы. На пленуме быў створаны рад груп па асобных пытаньнях. Але аб рабоце гэтых груп, аб вопыце перабудовы мы нічога ня чулі. ЦБ ня прымала ніякіх мер для арганізацыі абмену вопытам.

Важнейшым зараз зьяўляецца пытаньне праграм і мэтадаў выкладаньня ў ВНУ. ЦЗ не дапамагала нам у гэтай справе, а між тым тут больш чым дзе «кустарщына». Мы адарваны ад лекцыйнага мэтаду, але не ўдасканалілі яшчэ лябараторнага так, каб студэнт мог найлепш усвоіць той матар'ял, які яму даецца.

— У асяроддзі навуковых работнікаў—гаворыць тав. Крывіцкі—адбыліся за апошнія гады вялізарныя зрухі. Асноўная маса навуковых работнікаў актыўна змагаецца за выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва. Аднак, ёсьць асобныя работнікі, якія і зараз лічаць сябе «лойяльнымі» і працуюць не з энтузіязмам. Такога становішча асабліва нельга цярпець зараз, калі перад намі стаяць вялікай важнасьці задачы па перабудове навуковай работы.

— Быў час,—кажа т. Крывіцкі,—калі некаторыя навуковыя працаўнікі лічылі, што дыялектычна-матэрыялістычны мэтад ёсьць дадатак да экспэрымэнтальнай работы, што яго падаюць філёзофы і дыяматы ў гатовым відзе. Нікудышнасьць такой пастаноўкі відавочна. Навуковыя работнікі дыялектычным матэрыялізмам аўладаюць толькі тады, калі ўдарта будуць вывучаць Маркса, Леніна, Энгельса, Сталіна, калі яны ў аснову сваёй штодзённай работы пакладуць гэты мэтад.

Тав. Пераход (Гомель) гаворыць аб важнасьці і неабходнасьці прапрацоўкі праграм ВНУ на аснове марксызму-ленінізму. Тав. Пераход прыводзіць факт сваласаблівага ў гэтых адносінах перагібу: загалчык навучальнай часткі адной з ВНУ, які знаходзіцца ў рацэ, прапанаваў кіраўніком катэдраў у 3-х дзённы тэрмін перапрацаваць праграмы на аснове марксызму-ленінізму. Вядумоўна, перапрацоўку трэба праводзіць, як можна хутчэй. Але загадваць зрабіць гэта «в два счета», гэта значыць не разумець важнасьці справы.

— Балючым месцам у рабоце навукі ВНУ і па сёньняшні дзень зьяўляецца справа ўстанаўленьня профілю спэцыялістаў. На працягу году—гаворыць т. Дубравіцкі (Горкі)—асобныя ВНУ па 10 раз мяняюць праграмы і тэрміны навучаньня. Прычына заложана ў тым, што мы, навуковыя работнікі, слаба зьвязаны з вытворчасьцю. Работнікі тэхнічных ВНУ часта ня ведаюць становішча і пэрспэктыў разьвіцьця тэй галіны прамысловасьці, для якое яны рыхтуюць кадры спэцыялістаў. Сэкцыя навуковых работнікаў не займалася як сьлед гэтымі пытаньнямі і гэта дае сябе адчуваць на мясцох.

Далей у спрэчках выступалі т. Сакалоўскі, праф. Выдра, Палоў (Горкі) і інш.

* * *

Зьезд вітала делегацыя 1-ай усебеларускай канфэрэнцыі саюзу работнікаў МТС і батрацтва, а таксама прадстаўнік міжсэкцыйнага бюро інжынэрна-тэхнічных работнікаў.

* * *

На вячэрнім пасяджэньні зьезд заслухаў даклад тав. Вальфсона аб дзейнасьці цэнтральнага бюро сэкцыі навуковых работнікаў БССР.

Сёньня з раніцы распачынаюцца спрэчкі па гэтым дакладзе.

НА ВОДНЫХ ШЛЯХОХ

На штурм прарываў у рабоце рэчнага транспарту

Рачны транспарт БССР павінен адыграць вялікую ролю ў справе максымальнай разгрузкі чыгуначнага транспарту на парыяд асеньніх перавозак. Значныя масы бульбы, збожжа дроў, будматар'ялаў, якія павінен перавезьці рачны транспарт, патрабуюць надзвычайнага напружанай работы і мабілізацыі ўсіх унутраных рэсурсаў Дняпра-Дзьвінскага флёту.

Трэба ўлічыць, што рачны транспарт БССР уступіў у самы адказны пэрыяд асеньняй навігацыі з вялікім прарывам у выкананьні транспфінпляну. Па становішчы на 1 кастрычніка 1931 г. гадавы плян перавозак выкананы толькі на 63 проц.

Галоўная прычына прарыву заключаецца ў адсутнасьці цьвёрдага адзінаначальля, штодзённага апэрацыйнага кіраўніцтва і барацьбы з канкрэтнымі парушэньнямі працоўнай дысцыпліны.

Пасобныя раёны Дняпра-Дзьвінскага басэйну да гэтага часу ня ўжылі ніякіх захадаў да забесьпячэньня бесьперабойнай работы флёту на сваім вучастку і зараз знаходзяцца ў надзвычай цяжкім становішчы. Асабліва ў гэтым пытаньні адстаюць Віцебскі раён, які выканаў гадавы плян па ўсіх паказальніках толькі на 46 проц., а верасьнёўскі—на 42 проц.

Калі мы маем больш-менш здавальняючае становішча з працдысцыплінай на паравым флёце, дзе працуе асноўная маса старых воднікаў, дык зусім дрэнная справа на непаравым флёце. Непаравы флёт абслугоўваецца у большасьці выпадкаў навічкамі і сярод іх асабліва разьвіты рвацкія тэндэнцыі, прагулы і п'янкі.

На агульным сходзе камандзіраў непаравога флёту Віцебскага раёну, які адбыўся 7 кастрычніка, было высьветлена, што ўся работа непаравога флёту не пераведзена на зьдзельшчыну. З гэтай прычыны некаторыя каманды надзвычай дрэнна працуюць, хаваюцца «ад ветраў» і г. д. Гаспадарчы разрахунак і жорсткі кантроль рублём адсутнічаюць. Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі яго гэта своячасова не рэагуюць, культмасавая і выхаваўчая работа сярод рабочых непаравога флёту Віцебскага раёну не праводзіцца.

На агульным сходзе быў таксама выяўлен рад злачынстваў, якія зрываюць транспфінплян. Напрыклад, былы ўласьнік Эпштэйн, які меў свой параход, зараз «працуе» ў якасьці корніка і займаецца школьніцтвам. Корнікі лайбы № 46 адлетаслісь у 50 кілёмэтраў ехалі і дзён. Корнік Стрэнзад, каб ня ехаць ноччу, накіраваў лайбу № 33 на бераг, мошныя ўрэзаліся ў пясок і прастаяла з кацерам цалую ноч. Нехта Апэнка на параходзе «Вяліса» засунуў трапку ў кавэтраную помпу і кінуў кавалак жалеза ў машыну, дапамагальнага ходу. Толькі дзякуючы добрай рабоце ўсёй каманды, аварыя параходу была папраўдзкана. Але трэба адзначыць, што ні адміністрацыя раёну, ні мясцком на гэтыя агідніейшыя факты да апошняга часу не рэагавалі. Апэнка яшчэ дагэтуль не арыштаваны, а працягвае «працаваць»... да скаргі чытыня сьледзтва.

Посьпех выкананьня пляну па перавозцы грузаў у пэрыяд асеньняй навігацыі ў значнай ступені вырашае самаадданасьць непаравога флёту, Буксіры паравы флёт ня можа спраўдзіць а непаравога усяго непаравога флёту. Вялікая колькасьць лайб і баржаў ісьці самаадвалам, а ў некаторых мясцох пры дапамозе гужтранспарту. Але прыходзіцца адзначыць, што на гэтым вучастку ў нас яшчэ ня ўсё добра. Да сёньняшняга дня самасплаў праводзіўся чарапашымі тэмпамі пры яўнай незацікаўленасьці саміх брыгад. Прычына олабога ўкараненьня самасплаву хаваецца ў тым, што адміністрацыя не прэміюе лепшых ударных каманд, якія своячасова і ўзорна разгортваюць барацьбу за самасплаў.

Вялікую ролю ў справе пасьпяховага выкананьня пляну асеньняй навігацыі павінны адыграць дыспэтчары. На справе гэта ня так. Прарыў транспфінпляну ў вялікаў ступені тлумачыцца іменна дрэннай работай дыспэтчарскага апарату, які ня кіруе своячасова флётам, які займаецца чым хочаце, толькі не сваёй справай. Дняпра-Дзьвінскае кіраўніцтва пытаньню падбору і падрыхтоўкі дыспэтчарскіх кадраў зусім не аддае патрэбнай увагі. Яркім прыкладам гэтага можа служыць наступны характэрны факт. Па Віцебскім раёне Дняпра-Дзьвінскае кіраўніцтва прызначыла на пасаду дыспэтчара нейкага Сімаеноўскага, які да гэтай пасады быў тэхсакратаром. Сімаеноўскі на курсах дыспэтчара ня быў і ў гэтай справе нічога не разумее. У выніку, замест сапраўднага штодзённага кіраваньня флётам, Сімаеноўскі ўвесь дзень сядзіць у канцылярыі і капаецца ў паперах. Такія адносіны да падбору дыспэтчарскага апарату нікуды ня варты. Работа дыспэтчараў на рачным транспарце павінна быць узята пад штодзённы грамадзкі кантроль.

Кліентура па-ранейшаму ганебна адносіцца да выкананьня сваіх дагавароў, затрымлівае судны пад нагрузкай і выгрузкай на сотні гадзін і плоціць дзесяткі тысяч рублёў няўстойкі. Канкрэтных віноўнікаў, якія разбазарваюць дзяржаўныя сродкі, трэба прыцягваць да крымінальнай адказнасьці.

Рачны транспарт БССР зараз уступіў у самы адказьнейшы пэрыяд асеньняй навігацыі. Патрэбны рашучыя загады каб на-ходу ліквідаваць прарывы і перабудаваць работу так, каб поўнасьцю выканаць плян асеньняй навігацыі

Райкамвод у сувязі з Кастрычніцкім сьвятам і чарговым пленумам ЦК КП(б)Б абвясьціў месячнік штурму. Воднікі БССР за час штурму павінны паказаць сапраўдныя ўзорныя прыклады ўдарнай баявой работы.

У Віцебску штурм пачаўся з таго, што, пасьля абгаварэньня гэтага пытаньня, пасьля прыняцьця канкрэтных сустрэчных трансфінплянаў, воднікі ў 12 гадзін ночы пайшлі разгружаць лайбы і заработак ад гэтай работы аддалі ў карысьць Мопр'у.

Воднікі БССР да чарговага пленуму ЦК КП(б)Б павінны рапартаваць пралетарскай грамадзкасьці аб новых перамогах у выкананьні плянаў асеньняй навігацыі трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Н. Г.

Падрыхтоўку да торфасэзону—на поўны ход

Ніводнага кілёграма торфу НЕ ПАКІНУЦЬ НА ПАЛЁХ СЬЦІЛКІ

Шырокім фронтам разгарнуць будаўніцтва і падрыхтоўку балот

Больш увагі будаўніцтву торфазаводу ім. Гея

СМАЛЯВІЧЫ. (Па тэлеграфу). Торфазавод імя Гея будуецца на выгоднай балотнай плошчы, недалёка ад чыгуначнай станцыі Смалявічы і ляжыць паміж двума прамысловымі цэнтрамі Мнеск—Барысаў. Такое месцазнаходжаньне заводу дае магчымасьць забясьпечыць торфам Менскі «Эльвод» і рад іншых прадпрыемстваў. Аднак, будаўніцтва заводу затрымліваецца.

Не хапае будаўнічых матар'ялаў, цьвікоў, жалеза і т. д. Белторф ня ўкажыцца хутчэйшым сканчэньнем будаўніцтва торфазаводу.

Культурна-бытавое абслугоўваньне рабочых пастаўлена кепска. Рабочыя не атрымліваюць спэцвопраткі, сталоўка не забясьпечвае рабочых добраякасьнымі абедамі.

Белторфу трэба зьвярнуць больш увагі на будаўніцтва заводу і не дапусьціць яго зрыву.

Мухін Янка.

Неадкладна ліквідаваць прарыў на торфзаводзе „Грэбянёва“

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). З уборкай і сушкай торфу торфазавод «Грабянева» спраўляецца ня зусім здавальняюча. Вы працавана 25.351,7 тоны, высушана і складзена ў штабелі 18.760 тон, што складае 87 проц. усяе здабычы.

Надзвычайна дрэнная справа з вывазкай: па пляне намечана вывезьці ў трэцім квартале 7.000 тон, а вывезена ўсяго 2.463 тоны, што складае 36 проц. пляну. Тлумачыцца гэта тым, што дырэкцыя фабрыкі імя Куйбышава, якая зьяўляецца спажыўцом усяе прадукцыі торфазаводу, зусім ня цікавіцца вывазкай. Замест таго, каб штодзённа забясьпечыць 1.200 фурманак для вывазкі, фабрыка дае ўсяго 46.

Мясцовыя арганізацыі павінны дапамагчы торфазаводу ў ліквідацыі прарыву.

Л. МАРСКІ.

25 га замест 1000

Торфазавод «Чырвоны Сьцяг» зусім ня рыхтуецца да торфасэзону 1932 г. З плошчы ў 1.000 га падрыхтавана толькі 25. Патрэбна рабочых для падрыхтоўкі балот і будаўнічых работ 2.500 чалавек, ёсьць 400. Белторф ня думае аб набыцьці машын. На заводзе працуе з перабоямі толькі адзін трактар, адсутнічаюць граблі для трактароў і запасныя часткі.

Няправільная расстаноўка рабочай сілы прывяла да таго, што на балоце ляжыць няўбраным 2.000 тон торфу. Для ўборкі патрэбна 200 рабочых, а працуе толькі 55.

На Чарыцкім пасёлку многа няўбранага торфу, а працуе на ўборцы толькі 10 тарфяніц. З цэнтральнага пасёлку можна перакінуць некалькі брыгад для дапамогі — гэтага на зроблена.

З вывазкай торфу — надзвычай дрэнна. Пракладка ляжневых дарог праходзіць чарапашымі тэмпамі. Галоўная прычына—адсутнасьць патрэбнай колькасьці рабочай сілы. Мясцовыя арганізацыі не аказваюць дапамогі заводу ў арганізаваным наборы рабочых. Будаўніцтва баракаў і дарог пастаўлена пад сур'ёзную пагрозу зрыву.

Плян на будаўніцтве выкананя усяго толькі на 45 проц. Зімовымі кватэрамі завод забясьпечана толькі для 200 рабочых, а патрэбна кватэр на 700. Ураўнілаўка ў зарплаце не ліквідавана, прэміяльна-прагрэсыўная зьдзельшчына ня на адным вучастку ня ўведзена.

Культурна-выхаваўчая работа сярод рабочых не вядзецца. Партыйная і камсамольская ячэйкі і тарфком амаль бяздзейнічаюць.

Белторфу і мясцовым арганізацыям неабходна сур'ёзна ўзяцца за разгортваньне будаўніцтва на заводзе і падрыхтоўку балот да торфасэзону 1932 г.

Калектыўны рэфэрат «Зьвязды» — РЭДАКЦЫЯ «ШЛЯХ КАЛЕКТЫЎІЗАЦЫІ».

Гомельскі гарсавет зрывае вывазку торфа

ДОБРУШ (брыгада «Зьвязды» Недахват апалу значна павялічыў прастой паравых машын на Добрускай фабрыцы «Гэрой працы». Вывазка торфу для фабрыкі пастаўлена пад сур'ёзную пагрозу зрыву. Гомельскі гарсавет нічога не зрабіў у справе забясьпячэньня фурманкамі торфазаводу для вывазкі торфу на пара-сілавую станцыю фабрыкі.

Неабходна фарсаваць вывазку торфу Гомельскі гарком партыі не павінен дапусьціць да таго, каб паравыя машыны стаялі.

НЗАДЛІН, КЛІМЕНАК.

ЛЕПЕЛЬСКІЯ ГЕРОІ АБУРА

Год выдання—XV
№ [illegible]
Чацвер 22 кастрычніка
Цана нумара 5 кап.
выходзіць
БЕСПЕРАПЫННА

ЗЬВЯЗДА
Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
Менск, [illegible], 63.
Тэлефоны:
рэдактар—[illegible], сакратар—13-14, партсектар—13-80, прамысл.—13-80, сав. вяс.—6-17, масл.інфарм.—6-13, замест. інфарм.—6-19, начны рэдактар—6-17, [illegible] інфарм—[illegible], кантора выд.-[illegible]—[illegible]

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа прыватніку"

БЯЗЬЛІТАСНА ЗМАГАЦЦА З КУЛАЦКІМІ СПАЖЫВЕЦКІМІ ТЭНДЭНЦЫЯМІ

Выкананьне плянаў збожжазагатовак—першарадная задача калгасаў, саўгасаў, МТС і аднаасобнікаў

АГОНЬ ПА АПАРТУНІСТАХ--АГЕНТУРЫ КУЛАЦТВА У РАДОХ ПАРТЫІ

Узмацніць палітыка-растлумачальную работу сярод калгасьнікаў пад лёзунгам „выкананьня ў першую чаргу пляну здачы збожжа дзяржаве ў поўным аб'ёме", выкрываючы кулацкі характар прапаноў аб затрыманьні збожжа і мабілізуючы калгасныя масы на хутчэйшае выкананьне пляну збожжаздачы

Пастанова Савету Народных Камісараў СССР

У мэтах забесьпячэньня поўнага і своячасовага выкананьня ўстаноўленага пляну збожжазагатовак, Савет Народных Камісараў СССР пастанаўляе:

1. Пацьвердзіць пастановы Калгасцэнтру СССР і РСФСР і Трактарацэнтру ад 18-га кастрычніка аб абавязковасьці для калгасаў першачарговага выкананьня збожжазагатоўчых плянаў і аб адмене бранірОўкі збожжавых кармавых фондаў для жывёлы і жывёлагадоўчых фэрм калгасаў за лік пляну збожжазагатовак.

2. Прапанаваць НКЗему і НКСнабу СССР прыняць неадкладныя меры да адмены ўсіх распараджэньняў па лініі НКЗму і НКСнабу, паколькі гэтыя распараджэньні прадугледжваюць стварэньне ў калгасах ці ў саўгасах збожжавых фондаў за лік установленага дзяржавай пляну збожжазагатовак.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР
В. МОЛАТАЎ (Скрабін).

Кіраўнік справаў Савету Народных Камісараў СССР П. КЕРЖАНЦАЎ.
19 кастрычніка 1931 г.

„Да 14 гадавіны Кастрычніка выканаць поўнасьцю плян збожжазагатовак"

--высунулі лёзунг перадавыя калгасы, беднякі і сераднякі Бабруйшчыны

Бабруйская раённая партыйная арганізацыя рапартуе ЦК КП(б)Б, СНК БССР і рэдакцыі газэты „Зьвязда", што пад выпрабаваным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, пры бязьлітаснай барацьбе з апартуністамі і нацыску на кулацка-заможную частку вёскі, раённы плян цэнтралізаваных загатовак па мясе, бульбе, плодагародніне, сене і адгрузцы бульбы рабочым Ленінграду — **Бабруйскім раёнам перавыкананы:** мяса трэба паводле гадавога пляну, загатовіць да 1-га кастрычніка 1931 г. 1.314,7 тон, а загатоўлена на гэты-ж час 1.325,8 тон або 100,8 проц., бульбу, паводле пляну Наркамснабу, патрэбна было вывезьці за межы БССР для ЛСПА 1.800 тон і паводле прынятага сустрэчнага раённага пляну—2.300 тон, адгружана-ж 2.365 тон, або 131,4 проц. цэнтральнага — 103 проц. сустрэчнага раённага пляну. На яблыках гадавы плян загатовак — 800 тон, загатоўлена-ж 835 тон, альбо 104,3 проц. Адгрузка яблык ідзе далей. Капусты, паводле пляну, патрэбна было вывезьці Ленінграду 150 тон, адгружана-ж 205 тон — 137 проц. пляну; сена трэба было загатовіць 1.300 тон, загатоўлена-ж 1.307 тон — 100,5 проц. пляну.

Перадавыя калгасы, беднякі і сераднякі-аднаасобнікі, пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, высунулі лёзунг — **«да XIV гадавіны Кастрычніка выканаць поўнасьцю плян збожжазагатовак».**

Раённая партыйная арганізацыя заклёўне ЦК КП(б)Б і СНК БССР, што ўзятыя тэмпы загатовак будуць яшчэ больш узмоцнены і задачы, ускладненыя партыяй і ўладай па выкананьні плянаў усіх відаў загатовак, пры мабілізацыі калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі — будуць выкананы і перавыкананы.

Сакратар Бабруйскага райкому КП(б)Б
ВАЎКОВІЧ.

Старшыня райвыканкому
СЬЦЯПАНАЎ.

Старшыня райспажыўсаюзу
ЕРАНБУРГ.

НЯМА НАЦІСКУ НА КУЛАКА

БУДА-КАШАЛЁВА.

Плян збожжазагатовак па Буда-Кашалёўшчыне — пад пагрозай зрыву.



Здача збожжа.

Гадавы плян па раёне на 15 кастрычніка **выканан на 33,6 проц.**

Асабліва дрэнна стаіць справа са спагнаньнем збожжа з кулацка-заможных гаспадарак па цьвёрдых заданьнях. Пасобныя сельсаветы яўна патураюць кулацтву, ня ўжываюць суровых мер да кулакоў, якія злосна сабатуюць здачу збожжа. Буда-Кашалёўскі сельсавет за невыкананьне цьвёрдых заданьняў штраф фуе кулакоў на... 10-15 руб Зразумела, што гэтыя дробныя штрафы зусім ня ўплываюць на кулакоў і не даюць ніякіх рэальных вынікаў Кулак плаціць штраф і па-ранейшаму працягвае сабатаж загатовак. У выніку з кулакоў і заможнікаў па цьвёрдых заданьнях замест 52,7 тоны, спагнана ўсяго 5,6 тоны, або 11,3 процантаў.

Праваапартуністычнай практыцы пасобных сельсаветаў Буда-Кашалёўшчыны трэба даць руйнуючы адпор. Раённыя арганізацыі абавязаны праверыць работу сельсаветаў, прыцягнуць да адказнасьці работнікаў, якія патураюць кулацтву. Трэба бязьлітасна націснуць на кулака, прымусіць яго неадкладна і поўнасьцю выканаць цьвёрдыя заданьні. Раённыя арганізацыі абавязаны па-бальшавіцку разгарнуць масава-палітычную работу вакол збожжазагатовак.

Д.

Пасьля 4 гадзін склады закрыты...

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. (Наш кар.).

Збожжазагатоўчая кампанія па Мсьціслаўшчыне праходзіць самацёкам. Гадавы плян выкананы на 28,4 проц. Улік заготовак не наладжан. Пасобныя работнікі загатоўчай базы адносяцца значнымна нядбайна да сваіх абавязкаў і зусім ня цікавяцца ўзмацненьнем збожжазагатовак. Былі выпадкі, калі здатчыкі збожжа, якія прыяжджалі з чырвонымі абозамі, зьвярталіся дадому, ня здаўшы прадукцыі з тэй прычыны, што... пасьля 4-х гадзін дня прыёмшчыкі адмаўляліся працаваць і зачынялі склады. Раённая арганізацыя не прыцягнулі да адказнасьці вінаватых у гэтых агіднасьцях.

Мсьціслаўскі Дзяржбанк выдаткоўвае грошы, прызначаныя для збожжазагатовак, на іншыя кампаніі. У выніку на прыёмачнай базе часта не хапае грошай для разьліку са здатчыкамі. На сёнешні дзень на руках у здатчыкаў знаходзяцца неаплочаныя квіткі за 350 тон збожжа, прычым шмат квіткоў былі выданы яшчэ ў пачатку кампаніі.

Гэтыя ненармальнасьці павінны быць рашуча зьнішчаны. Разьлік са здатчыкамі павінен утварацца на месцы прыёмкі, без усякіх затрыманьняў.

Значным тормазам у загатоўках збожжа зьяўляецца несвячасовая падача вагонаў на станцыі чыгункі. За час з пачатку кампаніі і да 15 кастрычніка замест занаранаваных дэкаднымі заяўкамі 65 вагонаў, падана ўсяго 12. Зараз склады перапоўнены збожжам, што тармозіць далейшую прыёмку.

Чыгунка павінна ва што-б ні стала наладзіць рэгулярную падачу вагонаў згодна заявак. Трэба зараз-жа разгрузіць склады і ўзмоцніць прыём збожжа.

БАРЫСЕВІЧ.

АДОЗВА ЗАСТАЛАСЯ ПАРАДНАЙ ДЭКЛЯРАЦЫЯЙ

Калгасы Капыльшчыны павінны выканаць узятыя на сябе абавязацельствы

Капыльскі раён паводле ўрадавага заданьня павінен загатовіць 3.000 тон збожжа. На 15-га кастрычніка загатоўлена толькі 27,6 проц. заданьня.

Недапушчальна адстаюць калгасы, якія па 10-га кастрычніка далі толькі 23,6 проц. свайго заданьня. Калгасы Капыльшчыны яшчэ ў жніўні зьвярнуліся з адозвай да ўсіх калгасаў БССР, у якой абавязаліся поўнасьцю і своячасова выканаць плян збожжазагатовак і дапамагчы аднаасобнаму сэктару ў правядзеньні кампаніі.

Аднак, калгасы Капыльшчыны ня стрымалі свайго слова. Гэта адозва засталася толькі парадная дэкларацыяй, чужыцьцёўленай на практыцы.

Калгасы Капыльшчыны павінны наладзіць працуючае і выйсьці на перадавыя пазыцыі збожжазагатовак. Трэба арганізаваць масавую здачу збожжа дзяржаве, патокам чырвоных абозаў пакрыць свой доўг.

Капыльскі раён можа і павінен даць 3.000 тон збожжа дзяржаве. Для гэтага патрэбна толькі ўзьняць збожжазагатоўкі на адпаведную палітычную вышыню, трымаць увесь час высокія тэмпы работы, рашуча змагацца з праваапартуністычнай практыкай, даваць руйнуючы адпор спажывецкім тэндэнцыям.

Трэба рашуча націснуць на кулацка-заможныя элементы, прымусіць іх поўнасьцю і своечасова выканаць цьвёрдыя заданьні. На сёнешні дзень на гэтым участку справа стаіць зусім дрэнна. За ўвесь час цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак спагнаны толькі на 15,7 проц. Пасобныя сельсаветы яўна патураюць кулацкаму сабатажу. Так, **Капыльскі местачковы савет** спагнаў толькі 2,2 проц. цьвёрдых заданьняў, **Бабаўнянскі — 3,3 проц., В. Раёўскі — 6 проц.**

Трэба выкарчаваць спажывецкія, кулацкія тэндэнцыі, якія нагадваюцца ў некаторых калгасах і выяўляюцца ў разбазарваньні збожжа, у імкненьнях за лік збожжазагатоўчага пляну і да яго выкананьня стварыць розныя брасіяваныя фонды.

Кіруючыя раённыя арганізацыі павінны ўжыць рашучыя меры для максымальнага ўзмацненьня збожжазагатовак як у калгасах, так і ў аднаасобным сэктары, павінны сапраўды па-бальшавіцку арганізаваць кампанію.

С. Г.

БЕЛКАЛГАСНАСЕНСАЮЗ

ПРАВАЛІЎ ВЕРАСЬНЁЎСКІ ПЛЯН ЗАГАТОВАК НАСЕНЬНЯ КУЛЬТУРНЫХ ТРАЎ

60 раёнаў трымаюць пляны загатовак у партфэлях, кулацка-заможныя гаспадаркі яшчэ не атрымалі цьвёрдых заданьняў

Па заданьні ўраду засеў траў і кораньплодаў у трэцюю бальшавіцкую вясну павінен быць пашыран амаль што ў чатыры разы параўнальна з засевам у 1931 годзе.

Для засеву запраектаванай плошчы патрабуецца вялікая колькасьць насеньня розных траў і кораньплодаў. Калюшыны патрэбна ня менш 30.000 цэнтнераў, вікі—372.000 цэнтнераў, насеньня сэрадэлі—50.000 цэнтн., кораньплодаў—9.800 цэнтн. Апрача таго на пашырэньне гародняй гаспадаркі да 90.000 гэктараў супроць 68.000 гэкт. у 1931 г. патрэбна ня менш 25.000 цэнтн. насеньня розных гародных культур.

Зразумела, што **разьлічваць на завоз** вызначанай колькасьці насеньня з-за межаў **БССР нельга.** Трэба ў першую чаргу мабілізаваць усе насенныя рэсурсы ў межах БССР, стварыць неабходныя насенныя фонды ў кожным калгасе і неадкладна разгарнуць загатоўку насеньня ў такім разьмеры і такімі тэмпамі, каб своечасова забясьпечыць насевы ў 1932 годзе.

Плян загатоўкі насеньня прынят і зацьверджан урадам яшчэ ў пачатку жніўня месяца. Асноўныя загатоўшчыкі Белканторы Саюзнасеннаводу: **насенная каапэрацыя, Белхлебжывёлсаюз і Белсадсаюз** абавязаны да **1 студзеня 1932 г.** загатовіць і сабраць па кантрактацыі насеньня капюшыны 13.500 цэнт., вікі—79.000 цэнтн., сэрадэлі — 4.500, лубіну—42.000 цэнтн., кораньплодаў—3.695 і гародных культур—3.540 цэнтнераў.

Ня гледзячы на ўсю важнасьць гэтай задачы, мы павінны адзначыць, што да загатовак насеньня загатоўшчыкі да гэтага часу не прыступілі. Верасьнёўскі плян загатовак сарваны.

Белкалгаснасенсаюз, які зьяўляецца адзіным загатоўшчыкам па 40 галоўных насеннаводчых раёнах, нават сам не падрыхтован да прыёму і загатоўкі насеньня. Яго насенныя базы нежлым чынам не падрыхтаваны. У 10-ці раёнах няма складзіных памяшканьняў, няма рахункаводаў, і ёсьць такія раёны, у якіх зусім няма ўпаўнаважаных насенбаз (Горацкі, Бешанковіцкі і Кліча́ўскі). Вядома, што аб загатоўцы насеньня тут гаварыць ня прыходзіцца.

Белхлебжывёлаўдасаюз, Садсаюз і Ільнасаюз зусім ня маюць вестак з раёнаў аб загатоўцы насеньня, гэта справа іх мала цікавіць.

У выніку гэтага мы маем, што загатоўшчыкі ў раёнах пляны прынялі, а да ажыцьцяўленьня іх не прыступілі. **Пляны не даведзены** да нізавых звяньняў, калгасаў, кантрактантаў і вытворцаў насеньня. **Да гэтага часу ня даны цьвёрдыя заданьні кулацка-заможным гаспадаркам.**

Патрэбен карэнны пералом. Загатоўшчыкі насеньня як цэнтральныя, так і раённыя павінны пакончыць са сьпячкай і перабудаваць сваю работу так, каб да 1 студзеня цалкам і поўнасьцю выканаць пляны загатовак. Трэба цалкам скарыстаць крэдыты, адпушчаныя на загатоўку насеньня, **азнаёміць калгаснікаў і аднаасобнікаў з цэнамі на насеньне, якія значна вышэй мінулага году.** Трэба даць рашучы адпор тым апартуністам, якія будуць зрываць загатоўкі і апраўдвацца «аб'ектыўнымі прычынамі».

МАБІЛІЗАЦЫЯ СРОДКАЎ

УДАРНІКІ ЗАВОДАЎ штурмуюць прарывы ў фінпляне

Перадавыя прадпрыемствы дапамагаюць правядзеньню фінэстафэты на адсталых вучастках

Да Кастрычніцкіх сьвят рапартаваць аб выкананьні 50 проц. фінпляну чацьвертага кварталу

ФІНЭСТАФЭТА, ЯКАЯ ЗАРАЗ ПРАВОДЗІЦЦА ЦП САЮЗУ ФІНБАНКАЎСКІХ РАБОТНІКАЎ І НКФ, ДАЛА ЗНАЧНЫЯ ВЫНІКІ. ФІНАРМЕЙЦЫ ЗАВОДУ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА ДАБІЛІСЯ СТОПРОЦАНТНАЙ ПАДПІСКІ РАБОЧЫХ НА ПАЗЫКУ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА, СТОПРОЦАНТНАГА ЎЦЯГНЕНЬНЯ РАБОЧЫХ ВА ЎКЛАДЧЫКІ АШЧАДКАСЫ І ПОЎНАГА АХОПУ ІХ КАЛЕКТЫЎНЫМ І ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ СТРАХАВАНЬНЕМ.

БУКСІРНЫЯ БРЫГАДЫ ЗАВОДУ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА ДАБІЛІСЯ ЗНАЧНАГА ЗРУХУ ФІНРАБОТЫ НА ФАБРЫЦЫ «КАМУНАР» І ЗАВОДЗЕ «ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫК».

ПА ПРЫКЛАДЗЕ ВАРАШЫЛАЎЦАЎ МЕНСКАЯ КУШНЕРНАЯ ФАБРЫКА ЎЗЯЛА НА БУКСІР ФАБРЫКУ ІМЯ 8-га САКАВІКА.

ПРЫКЛАДУ ВАРАШЫЛАЎЦАЎ ПАСЬЛЕДВАЛІ ТАКСАМА ШОЎКАВАЯ ФАБРЫКА ІМЯ КУЙБЫШАВА Ў МАГІЛЕВЕ, ЗАВОД ІМЯ ХАЛТУРЫНА Ў БАБРУЙСКУ, ЯКІЯ ЎКЛЮЧЫЛІСЯ Ў ФІНЭСТАФЭТУ І ЎЗЯЛІ НА СЯБЕ РАД АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ ПА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНІ ВЫКАНАНЬНЯ ФІНАНСАВАГА ПЛЯНУ.

РАБОЧЫЯ, СЛУЖАЧЫЯ І ТЭХПЭРСАНАЛ ФАБРЫКІ ІМЯ КУЙБЫШАВА ВЫБРАЛІ СПЭЦЫЯЛЬНЫ ШТАБ ПА КАНТРОЛІ НАД ПАДШЭФНЫМІ ФІНАНСАВА - БАНКАЎСКІМІ ЎСТАНОВАМІ, ВЫЛУЧЫЛІ 5 САЦСУМЯШЧАЛЬНІКАЎ У ФІНАНСАВЫЯ ЎСТАНОВЫ І ЎЗЯЛІ НА БУКСІР 10 ПРАДПРЫЕМСТВАЎ МАГІЛЕЎШЧЫНЫ, ЯКІЯ АДСТАЮЦЬ У ВЫКАНАНЬНІ ФІНПЛЯНУ. ФАБРЫКА ВЫЛУЧЫЛА 30 РАБОЧЫХ, ЯКІЯ НАКІРАВАНЫ Ў ПАДШЭФНЫЯ СЕЛЬСАВЕТЫ ДЛЯ ДАПАМОГІ Ў ФІНРАБОЦЕ.

УСЯ РАБОТА ПРАВОДЗІЦЦА ПАД ЛЁЗУНГАМ АРГАНІЗАЦЫІ РАПАРТУ ДА XIV-ай КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ АБ ВЫКАНАНЬНІ ПЛЯНУ МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ 4-га КВАРТАЛУ НЯ МЕНШ, ЧЫМ НА 50 ПРОЦ.

ПРЫКЛАДЫ ЛЕПШЫХ ЗАВОДАЎ ПАВІННЫ БЫЦЬ ПАДХОПЛЕНЫ ЎСІМІ ПРАДПРЫЕМСТВАМІ БССР.

КАЙКОЎ.

Да 10 лістапада сабраць сумы па самаабкладаваньні

Раўненьне па сіроцінцах

Вялізарнейшы гаспадарчы і культурны ўздым калектывізаванай вёскі, ажыцьцяўленьне ўсеагульнага пачатковага навучаньня патрабуюць значных сродкаў.

Дзяржава адпускае на культурнае і гаспадарчае будаўніцтва вёскі з кожным годам усё большыя і большыя сумы. Аднак, адны толькі дзяржаўныя сродкі зьяўляюцца невыстарчальнымі, і для ажыцьцяўленьня ўсіх неабходных мерапрыемстваў па пабудове школ, больніц, вэтпунктаў, дарог і мастоў патрэбны дадатковыя сродкі і самога насельніцтва.

Гэтыя сродкі атрымліваюцца ў парадку самаабкладаньня, якое прымаецца агульнымі сходамі сялян. Грошы па самаабкладаньні ідуць на культурныя і гаспадарчыя мерапрыемствы, якія праводзяцца ў данай вёсцы.

Калгасныя і аднаасобныя бядняцка-серадняцкія масы сялянства на працягу году пераканаліся ў вялікай карысьці самаабкладаньня і ахвотна праводзяць гэта мерапрыемства.

Сёлета на БССР агульныя сходы па самаабкладаньні павінны былі быць закончаны яшчэ ў жніўні месяцы, сельсаветам трэба было перадаць паведамленьні плацельшчыкам не позьней 1 верасьня.

Між тым матар'ялы, якія ёсьць у Наркамфіне сьведчаць, што ў цэлым радзе раёнаў, дзе недаацанілі гэту важнейшую гаспадарча-палітычную кампанію сходы па самаабкладаньні значна запаздніліся. У некаторых раёнах сходы закончыліся толькі ў верасьні, а ў другіх не праведзены яшчэ і да гэтага часу.

Так, па Бялыніцкім сельсавеце, Касьцюковіцкага раёну плацельшчыкам яшчэ не перададзены паведамленьні. Як праходзіць кампанія па Ўраўніцкім раёне нагуль ненядома, бо райфінаддзел на працягу ўсёй кампаніі ня даў вестак.

Заслаўскі, Расонскі, Тураўскі і Чэрыкаўскі раёны да гэтага часу не паведамілі, на якую суму прынята самаабкладаньне. Гэта сьведчыць, што ў гэтых раёнах ня скончана налічэньне сум.

Зусім дрэнна паступаюць прынятыя па самаабкладаньні сумы. Так, на 10 кастрычніка паступіла ўсяго толькі 2,8 млн. руб., або 18,4 проц. замест вызначаных каля 4 млн. руб.

Недапушчальна слаба паступае самаабкладаньне па Чэрвеньскім раёне, які сабраў усяго 3,7 проц. прынятых сум, Чавускім—2 проц., Рэчыцкім—5 проц., Лоеўскім—6,6 проц., Жлобінскім — 6,1 проц., Буда-Кашалёўскім—5,5 проц., Барысаўскім — 4 проц., Асьвейскім—4,6 проц.

Рэкорд бязьдзейнасьці ў спагнаньні сум па самаабкладаньні паказаў Клімавіцкі раён, які на 10 кастрычніка не сабраў ні адной капейкі.

Недапушчальна дрэнна праходзіць спагнаньне самаабкладаньня з кулакоў. У той час, як кулакі павінны ў 7-дзённы тэрмін унесьці грошы па самаабкладаньні, на 10 кастрычніка па БССР з кулакоў спагнана толькі 45.000 руб., што складае ня больш 3 проц. налічаных на іх сум.

Узорныя прыклады работы па самаабкладаньні паказалі **Сіроцінскі, і Мсьціслаўскі** раёны, якія на 10 кастрычніка здолелі сабраць ад 40 да 50 проц. прынятых сум.

На працягу 4-га кварталу павінна паступіць 7 млн. руб. па самаабкладаньні, а разам з недаборам 3-га кварталу каля **9 з пал. млн. руб.**

Урад даў выразны тэрмін сканчэньня самаабкладаньня—не пазьней 10 лістапада.

Часу засталося вельмі мала. Для таго, каб дагнаць прапушчанае і выканаць своечасова заданьне, раённыя арганізацыі, сельсаветы і фінапарат павінны разгарнуць сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы, мабілізаваць вакол самаабкладаньня грамадзянскасьць і рашуча ўдарыць па апартуністах, якія зрываюць своечасовае выкананьне важнейшай кампаніі.

Р.

АТАКІ ГІТЛЕРАЎСКІХ БАНДЫТАЎ

сустрэлі адзіны рэвалюцыйны фронт адпору рабочых мас

Рэпэтыцыя грамадзянскай вайны на вуліцах Браўншвэйгу

Фашысты грамілі рабочыя раёны.—„Міністар—чалавек нэйтральны і аб'ектыўны"—супакойваў „Форвэртс" масы.—Праз галовы сваіх правадыроў ішлі сацыял-дэмакратычныя рабочыя ў рады чырвонай самаабароны

Поплеч змагаліся яны

БЭРЛІН, 20. Выступленьне нацыянал-сацыялістычных (фашысцкіх) банд у БРАУНШВЭЙГУ паскорыла працэс арганізацыі АДЗІНАГА ФРОНТУ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ РАБОЧЫХ З САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЧНЫМІ праз галаву сацыял-фашысцкіх правадыроў. Сацыял-дэмакратычныя рабочыя ў адзіным фронце з камуністамі шляхам удзелу ў атрадах чырвонай самаабароны адбілі большасьць атак нацыянал-сацыялістаў на рабочыя раёны.

Найбольш характэрным у антыфашысцкай барацьбе рабочых было цеснае аб'яднаньне сацыял-дэмакратычных рабочых з камуністычнымі. Ва многіх месцах члены рэйхсбанэру (поўаеная арганізацыя, якая знаходзіцца пад кіраўніцтвам сацыял-дэмакратаў), прымалі актыўны ўдзел у выступленьнях чырвонай самаабароны. Адзін атрад рэйхсбанэру прадаставіў сябе ў распараджэньне чырвонай самаабароны. Адзіны антыфашысцкі фронт правяўся тут з такой сілай, што нават «Форвэртс» вымушан прызнаць, што «ва многіх выпадках незапежна ад таго, члены гэта рэйхсбанэру ці ротфронту, рабочыя сумесна адбівалі атакі «гітлераўскіх малайцоў»

Напады фашысцкіх банд ня спыняюцца

БЭРЛІН, 20. У Браўншвэйгу працягваюцца напады нацыянал-сацыялістычных (фашысцкіх) банд на рабочае насельніцтва. Пры сутычцы была ляжка паранена адна работніца. За апошнія два дні ў рэзультаце сутычак паранена шмат рабочых. У Вольфэнбютэлі (не далёка ад Браўншвэйгу) нацыянал-сацыялістамі забіт адзін рабочы, два нацыянал-сацыялісты ляжка паранены. Сацыял-дэмакратычнае кіраўніцтва вядзе ў сувязі з падзеямі ў Браўншвэйгу нарэшце крытыку двурушнікоўю палітыку. Кіраўніцтва поўнаеннай арганізацыі сацыял-дэмакратаў, «рэйхсбанэр» апублікавала адозву аб падзеях у Браўншвэйгу, ацэньваючы іх як грамадзянскую вайну. Адзначаючы «Форвэртс» прабуе супакоіць масы, заяўляючы, што **няма прычын для неблясьпекі,** бо міністар унутраных спраў і міністар вайсковых спраў Грэнэр зьяўляецца «нэйтральным у адносінах да правых і аб'ектыўным да правых і левых».

Прафбюракраты згодны на зьніжэньне зарплаты

БЭРЛІН, 20. У канфліксе гарнякоў вугольнага раёну Вальдэнбург-Нэйродэ арбітр вынес пастанову аб 7 проц. зьніжэньні зарплаты. **Трацейская пастанова аб 7 проц. зьніжэньні зарплаты рабочым мэталюргічнай прамысловасьці** ў Шлезьме і Гагене (Рурская вобласьць) абвешчана абавязковай.

Між цэнтральным праўленьнем чыгунак і прафсаюзнымі бюракратамі пачаліся перагаворы аб зьніжэньні зарплаты чыгуначнікаў.

На прадпрыемствах створаны камітэты барацьбы

БЭРЛІН, 21. Прадпрыемцы, урадавы трацейскі судзьдзя і рэфармісцкія прафбюракраты маюць намер правесьці з 1-га лістапада зьніжэньне зарплаты бярлінскай мэталяпрамысловасьці, якое патрабуецца прадпрыемствамі, і пастаяць, такім чынам, рабочых перад адбытым фактам. Пад кіраўніцтвам чырвонага прафсаюзу мэталістаў і рэвалюцыйнай прафанапозіцыі на бярлінскіх мэталяпрадпрыемствах расьце падрыхтоўка рашучага адпору супроць наступленьня прадпрыемцаў на зарплату. На 20-ці бярлінскіх мэталязаводах ужо створаны камітэты барацьбы, якія вядуць работу па падрыхтоўцы забастоўкі.

Японія замацоўвае сваю акупацыю ў Манчжурыі

„Незалежасьць" пад японскімі штыхамі

БЭЙПІН, 20. **Камандуючы японскімі акупацыйнымі войскамі ў Манчжурыі генэрал Хондзіё прыбыў у Гірын, дзе быў урачыста спатканы прадстаўнікамі «новага» ўраду.** Паводле загаду Хондзіё некаторыя часьці японскіх войск выведзены з Гірыня з мэтай палегчыць становішча гірыньскага ўраду напярэдадні скліканьня канфэрэнцыі захаваць уладу. Выведзеныя часьці, якія разьмясьціліся вакол гораду, будуць у той-жа час гатовы аказаць гірыньскаму ўраду ў патрэбны момант «належную дапамогу». **Галоўныя брамы ў Гірыне ахоўваюцца японскімі салдатамі,** якія праводзяць дасканалыя і строгія запросы ўсіх прыбываючых, пры найменшай падазронасьці прыстасоўваюць жорсткія рэпрэсіі ў адносінах да западозраных кітайцаў.

Яшчэ адна марыянэтка Японіі

ШАНХАЙ, 20. Згодна японскіх паведамленьняў у Манчжурыі ўзьнік яшчэ адзін «рух за незалежнасьць» узначалены генэралам Лін-Ін-чынам, які арганізаваў паўночна-ўсходнюю «армію самаабароны» з галоўным штабам у Паньшане (да поўначы ад Цзіньчжоу), дзе ім сканцэнтравана 50 тыс. войск. Паводле паведамленьня японскага агенцтва «Ранго» армія Лін-Ін-чына выступіла сёньня «ў поўным напрамку». Перадаюць, што ў хуткім часе Лін-Ін-чын выступіць з заявай, накіраванай супроць Чжан-Сюэ-ляна і Чан-Кай-шы, і абвесьціць аб стварэньні новага ўраду і дасьць загад аб ачышчэньні Манчжурыі ад мілітарыстаў. Не падлягае сумненьню, што гэты «незалежны рух», падобна іншым, карыстаецца маральным і матар'яльным падтрыманьнем Японіі.

Перагаворы паміж Францыяй і Японіяй

ТОКІЁ, 21. У міністэрстве замежных спраў атрымана паведамленьне аб гутарцы Іосізавы з Брыянам накоўт 5-ці умоў, высунутых Японіяй для вырашэньня манчжурскага інцыдэнту. Брыян раіць адмовіцца ад 4-га пункту, спадзяючыся ў гэтым выпадку зрабіць адпаведны націск на Кітай з мэтай прыняцьця іншых пунктаў. У міністэрстве ўказваюць, што ў гэтым пункце гутарка ідзе пераважна аб чыгуначных правах Японіі, паколькі японскі ўрад лічыць, што іншыя япона-кітайскія дагаворы не адчуваюць патрэбы ў асобным прызнаньні.

Патрабуюць аднаўленьня кітайска-савецкіх адносін

ШАНХАЙ, 20. Сёньня адбылася **20-ці тысячная студэнцкая дэманстрацыя, накіраваная супроць Японіі.** Прадстаўнікі дэманстрантаў перадалі нанкінскаму ўраду прашэньне, у якім патрабуюць аднаўленьня дыпляматычных адносін паміж Кітаем і СССР.

Новыя катаржныя прысуды ў фашысцкай Польшчы

ВАРШАВА, 21. Адбыўся гэтымі днямі рад палітычных працэсаў. Сацыял-фашысцкі «РОБОТНІК» ад 20 верасьня паведамляе аб тым, што КОВЕЛЬСКІ АКРУГОВЫ СУД разглядаў справу абвінавачаных у «антыдзяржаўнай» дзейнасьці і прыналежнасьці да КПЗБ. Засуджаны: МУЖ І ЖОНКА ЦІМЕРМАНЫ ПА 4 ГАДЫ КАТАРГІ, АДЗІН АБВІНАВАЧАНЫ — НА 3½ ГАДЫ КАТАРГІ, ТРЫ — ПА 3 ГАДЫ І АДЗІН — НА 2 ГАДЫ.

У «ГАЗЭЦЕ ПОЛЬСКАЙ» ад 20 верасьня чытаем аб працэсе 17 АСОБ, сярод якіх ДВА ПАДАФІЦЭРЫ ПЯХОТЫ. Падсудных абвінавачвалі ў прыналежнасьці да кампартыі і рэвалюцыйнай дзейнасьці. Абвінавачаны ПЯНЬКО, як няпоўнагадовы, прыгаворан ДА ГОДУ ТУРМЫ. Іншыя падсудныя — ПА 4 ГАДЫ КАТАРГІ КОЖНЫ.

Рашуча змагацца супроць кулацкіх тэндэнцый у загатоўках

Ударыць па апартуністычнай практыцы

ХАРКАЎ, 19. Цэнтральны камітэт камуністычнай партыі бальшавікоў Украіны пастанавіў: **«За дапушчаныя праваапартуністычныя антыпартыйныя дзеяньні тав.** Жыгайла, сакратара Беладуцкага райпарткому, тав. Мажарэцкага, заг. аддзелу Кахаўскага райпарткому, тав. Клімена, заг. нам. старшыні Кахаўскага райвыканкому, тав. Шабанова, старшыню Кахаўскай РКК, тав. Тарана, дырэктара Кахаўскай МТС, тав. Харунжага, сакратара Златапольскага райпарткому, тав. Дапілава, сакратара Ліпінскага райпарткому і тав. Тушкава, старшыню Ліпенскага райвыканкому, якія сталі выяўленьнямі кулацкіх настрояў, — **зьняць з работы і выключыць з радоў КП(б)У.** Указаньня кіраўнікі ня толькі не мабілізоўвалі на выкананьне збожжазагатоўчага пляну партарганізацыю і калгасныя масы, ня толькі не арганізоўвалі націску на кулака, але самі фактычна сталі на чале апартуністычных элемэнтаў, выяўляючы супроць пляну збожжазагатовак.

Сакратаром раду райпарткомаў за тое, што яны не арганізоўвалі па-бальшавіцку збожжазагатовак, не мабілізоўвалі партыйных і калгасных мас, не арганізоўвалі націску на кулака, **выявіўшы свае апартуністычныя адносіны да пляну, якія былі паданы раёнам, — абвясьціць суровую вымову з папярджаньнем і зьняць з работы.** Бюро гэтых райпарткомаў абвясьціць вымову.

Адзначаючы яўна нездавальняючыя тэмпы збожжазагатовак у радзе раёнаў, ЦК пастанавіў папярэдзіць райпарткомы і ўпаўнаважаных ЦК, што калі ў бліжэйшую дэкаду ня будзе дасягнута рашучага пералому ў ходзе збожжазагатовак, ЦК прыме ў адносінах гэтых раёнаў **самыя суровыя меры.** З прычыны таго, што некаторыя таварышы, будучы ўпаўнаважанымі па збожжазагатоўках, ня здолелі мабілізаваць партарганізацыі на барацьбу за выкананьне пляну і не арганізавалі націску на кулацкія элементы, — **адклікаць рад упаўнаважаных ЦК.** За адсутнасьць бальшавіцкага кіраўніцтва работай МТС, за нездавальняючую арганізацыю ўборкі збожжа і аб малоту, за апартуністычныя адносіны да справы збожжазагатовак, у рэзультаце чаго выкананьне збожжазагатоўчага пляну калгасамі раёну МТС зьняўляецца ганебна малым, дырэктарам раду МТС абвешчана суровая вымова з папярджаньнем. Дырэктара Нова-Піраґоўскай МТС Зелянневіча, які апрача гэтага дапусьціў безадказныя адносіны да работы, паехаўшы самавольна ў напружаную парыяд збожжазагатовак у працяжную адлучку ў Крым, выключыць з радоў КП(б)У.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

„Чыр. Зорка" Пач. 7 і 8-45; 10-30 — АМЭРЫКАНСКІ ФІЛЬМ Даліна агністых скал. Драма ў 7 част.
„КУЛЬТУРА" Пач. 7; 8-45; 10-30 — Новы замежны фільм САПРАЎДНЫЯ ПАНЫ. ЗВЫШ ПРАГР. Ударная будоўля.
„Інтэрнацыянал" Адкр. з 12 ч. дня — Усходні мастацкі фільм ЗЭЛІМ ХАН. Звыш прагр. хроніка
ПРАЛЕТАРЫ Адкр. з 12 г. дня — Гаина СТЭН і МІЧУРЫН у мастацк. фільме ЗАЛАТАЯ ДЗЮБА. Пач. 1-га сэансу ў 2 г. дня.
„Юны Піян